

Ці быць храму?

Правяраем печы і апавяшчальнікі

Даўгалецце са знакам якасці

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

Родная газета на роднай мове

2 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 212 (28322)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СТАР. 6

ДУХМЯНАЯ МАЙСТЭРНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сям'і мінчанкі Валянціны МАРЧАНКІ ёсць свой пчальнік. Самой Валянціне даспадобы працаваць з пчоламі — даглядаць пчаліныя домікі, ставіць рамкі, качаць мёд. Аднойчы гэты занятак падказаў жанчыне кірунак у выяўленні творчай натуры — з гарачага воску Валянціна робіць скульптурныя свечкі, заліваючы яго ў формы са звычайнага чайніка. Свае духмяныя вырабы майстрыха прадае ў невялікай майстэрні-крамцы, якая знаходзіцца ў сядзібна-паркавым турысцкім комплексе «Дукорскі маёнтак» Пухавіцкага раёна.

Эканамічныя адносіны — на ўзровень асабістых і палітычных

Дзверы Беларусі заўсёды адчынены для Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і эмірата Дубай. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам і міністрам абароны ААЭ, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашыдам аль-Мактумам, паведамляе БЕЛТА.

«Дзякуй вам за добрыя словы, якія вы адрасавалі мне і маяму народу. У сваю чаргу хачу сказаць, што дзверы Беларусі для ААЭ і эмірата Дубай заўсёды адчынены. І я хацеў бы выказаць галоўную сваю пазіцыю на нашай сустрэчы, каб вы часцей бывалі ў Беларусі. У гэтым наш вялікі інтарэс. Нам трэба выводзіць нашы эканамічныя адносіны на ўзровень асабістых і палітычных», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу шэйх Мухамед бен Рашыд аль-Мактум адзначыў, што вельмі рады візіту Аляксандра Лукашэнкі. Ён таксама заявіў аб гатоўнасці ААЭ ў цэлым і эмірата Дубай у прыватнасці да далейшага развіцця адносін з Беларуссю. «Мы хочам развіваць гэтыя адносіны да лепшага», — сказаў ён.

Шэйх Мухамед бен Рашыд аль-Мактум таксама цёпла адазваўся пра Беларусь і яе людзей.

Як паведамляла «Звязда», напярэдадні ў сталіцы ААЭ адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Бакі абмеркавалі перспектыўныя напрамкі далейшага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін у розных галінах, у тым ліку гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне. Адной з тэм перагавораў стала сумесная работа і абмен вопытам у сферы высокіх тэхналогій і ўстойлівага развіцця. На перагаворах таксама былі падрабязна абмеркаваны і пытанні міжнароднага парадку дня.

ЗАСЛУЖАНАЕ ПРЫЗНАННЕ — ПРАФЕСІЯНАЛАМ

Учора прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ уручыў дзяржаўныя ўзнагароды 94 заслужаным грамадзянам.

Падзяку Прэзідэнта за падрыхтоўку пятага Усебеларускага народнага сходу атрымалі **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА** *(на фота)*, **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.**

Фота БЕЛТА.

Сярод узнагароджаных таксама — значная частка медыцынскіх работнікаў. Кіраўнік урада адзначыў, што ўпершыню за апошнія 20 гадоў у Беларусі нараджальнасць перавысіла смяротнасць. Па яго словах, гэта стала магчымым дзякуючы комплексным паслядоўным мерам дзяржаўнай палітыкі. «Натуральны прырост толькі за 9 месяцаў гэтага года назіраецца адразу ў 85 са 113 гарадоў, а таксама ў кожным трэцім пасёлку гарадскога тыпу. За гэтыя ж 9 месяцаў у краіне нарадзілася амаль 90 тысяч маленькіх беларусаў. Гэта на паўтысячы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Прычым большасць з іх — гэта ўжо другое і наступныя дзеці», — адзначыў ён. Андрэй Кабякоў нагадаў, што 1 лістапада выраслі дапамогі, якія выплачваюцца бацькам, што знаходзяцца ў адпачынку па догляддзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў.

СТАР. 2

ВІЦЕБСК НАБУДЗЕ НОВЫЯ РЫСЫ

Перспектывы забудовы гарадской прасторы

Да чарговага міжнароднага фэсту «Славянскі базар» плошча Свабоды стане пешаходнай. У абласным цэнтры сярод іншых з'явіцца новы «спальны» мікрараён «Чаромушкі». Але, бадай, самая сенсацыйная навіна — рэальная перспектыва аднаўлення касцёла XVIII стагоддзя. Яго можна будзе ўбачыць насупраць ратушы — сімвала Віцебска.



belarus-travel.livejournal.com

Горад «расцягнуўся» на трэць

Тэрыторыя горада над Дзвіной па ініцыятыве былога губернатара, цяперашняга кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Косінца павялічылася на трэць. Зразумела, на новых плошчах вялікі фронт работ для праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. А раней прыходзілася «лавіраваць». Напрыклад, каб не закрануць землі сельскагаспадарчага прызначэння.

— У 2011-м годзе адбылася знакавая падзея. Уявіце сабе: да гэтага ў гарадскіх межах было каля 9 тысяч гектараў. А далучылі больш за тры тысячы. Вельмі вялікая тэрыторыя: трэць ад таго, што было ў Віцебску, якому больш за 1000 гадоў, — расказвае **намеснік начальніка аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебскага гарвыканкама Леанід БАГДАНАЎ.**

Мінулы генеральны план горада быў зацверджаны ў 2003-м годзе. А да гэтага новага генплана не было 20 гадоў! Згодна з цяперашнімі патрабаваннямі, «пашпарты гарадоў» афармляюцца на пяцігодкі і зацвярджаюцца на ўзроўні кіраўніцтва краіны. Такім чынам, цяпер можна ўявіць, як зменіцца Віцебск да 2020 года. Калі на рэалізацыю задуманага хопіць фінансавання.

СТАР. 5

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі:

«Не толькі ваенна-палітычная, але і фінансава-эканамічная сітуацыя ў свеце дынамічна развіваецца. На мой асабісты погляд, праблема аператыўнага адэкватнага рэагавання на зменлівыя абставіны — гэта праблема нумар адзін для нашых галін і шэрагу прадпрыемстваў. На жаль, часам даводзіцца проста штурхаць некаторыя нашы прадпрыемствы, прымушаць адгукнуцца на нейкія прапановы знешніх партнёраў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.11.2016 г.

Долар ЗША	1,9040	▼
Еўра	2,0901	▲
Рас. руб.	0,0301	■
Укр. грыўня	0,0744	▼

■ На слыху

Не пакараць, а папярэдзіць

Новы падатак прымусіў многіх «шэрых» работнікаў выйсці з ценю

Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) накіравала каля 50 тысяч паведамленняў на аплату спецыяльнага збору тым, хто летась не ўдзельнічаў у фінансаванні дзяржаўных расходаў, паведаміла намеснік міністра па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА.
Памер збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год складае 360 рублёў (3,6 млн — «старымі»).

Стымул спрацаваў

Тут трэба нагадаць, што, калі яшчэ дакумент аб сацыяльным утрыманстве быў на стадыі ідэі, чыноўнікі паведамлялі: тых, хто не працуе і не плаціць падаткі, больш за 400 тысяч. А на справе іх аказалася ў разы менш. Чаму?

Спадарыня Шаўчэнка на падобную нестыкоўку ў лічбах адказала, што асноўнай мэтай. Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» было стымуляванне працаздольнага насельніцтва да працы і папярэджанне такога ўтрыманства як масавай з'явы. Невялікая колькасць накіраваных паведамленняў (гэта неканчатковая лічба) сведчыць аб тым, што часткова галоўная мэта ўжо дасягнута. Напрыклад, летась, пасля прыняцця дэкрэта, у 1,5 раза ўзрасла колькасць асоб, якія сталі на ўлік у якасці беспрацоўных. Таксама ўзрасла колькасць асоб, якія займаюцца дзейнасцю па заяўным прынцыпе, што не патрабуе рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП). Потым павялічылася колькасць занятых у сферы аграэкатурызму і рамеснікаў. Акрамя таго, у ІП на 22% выросла колькасць наёмных асоб. «Мы бачым, што стымуляванне актыўнасці працаздольнага насельніцтва адбылося», — падкрэсліла намеснік міністра.

СТАР. 2

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Ці будзе Украіна выбачацца?

Гісторыя з самалётам «Белавія», якога 21 кастрычніка пасля вылету з кіеўскага аэрапорта «Жуляны» пад пагрозай падняць знішчальнікі прымусілі вярнуцца назад, атрымала свой працяг. Учора была абнародавана расшыфроўка перамоў пілота беларускага самалёта і кіеўскага дыспетчара. Пацвярджаецца ўся тая інфармацыя, якая была распаўсюджана раней: сапраўды, была прамая пагроза, сапраўды, беларускі экіпаж, усведамляючы адказнасць за жыцці пасажыраў (а іх было 136 чалавек) падпарадкаваўся загаду і пасадзіў самалёт.

Расшыфроўка паказвае, што распараджэнне дыспетчара вярнуць самалёт паступіла вельмі нечакана і пачалося з пагрозы.

Дыспетчар:
— Белавія-840, Кіеў-Радар.
Пілот:
— Слухаю.
Дыспетчар:
— Белавія-840, паступіла ўказанне: вам трэба неабходна вярнуцца на аэрадром вылету «Жуляны». ЗА НЕВЫКАНАННЕ БУДЗЕ ПАДНЯТА БАЯВАЯ АВІЯЦЫЯ НА ПЕРАХВАТ.

Экіпаж пасадзіў самалёт паспяхова, у салон зайшлі прадстаўнікі Службы бяспекі Украіны і назвалі прозвішча аднаго з пасажыраў, якога забралі з сабой. Самалёт паляцеў у Мінск, затрыманы пасажыр — таксама, толькі наступным рэйсам. І... усё.

На наступны дзень, **22 кастрычніка**, у Міністэрства замежных спраў нашай краіны выклікалі Часовага павераната ў справах Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Валерыя Джыгуна і ўручылі яму ноту. Беларускі бок заявіў пратэст «у сувязі з дзеяннямі кампетэнтных органаў Украіны па прымусовым вяртанні беларускага паветранага судна авіякампаніі «Белавія», якое ажыццяўляла 21 кастрычніка 2016 года рэгулярны рэйс B2 840 па маршруце «Кіеў-Мінск». У ноце МЗС падкрэслена, што беларускі бок чакае афіцыйных выбачэнняў і патрабуе кампенсацыі ўсіх фінансавых выдаткаў, выкліканых дзеяннямі ўкраінскага боку.

Міністэрства замежных спраў таксама даручыла Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь ва Украіне Ігару Сокалу ўручыць аналагічную ноту пратэсту ва ўкраінскім МЗС.

Але адказу не было.

27 кастрычніка на чарговым брыфінгу для прадстаўнікоў СМІ **Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік управлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў** нашай дзяржавы, паведаміў, што рэакцыя ўкраінскага боку на ноту адсутнічае. «Калі яе не будзе і далей, то мы будзем вымушаныя распачаць дадатковыя крокі, аж да апублікавання расшыфроўкі перамоў членаў экіпажа з украінскім дыспетчарам», — заявіў Дзмітрый Мірончык.

І вось **1 лістапада** расшыфроўка апублікавана. Што далей? Карэспандэнт «Звязды» з гэтай нагоды ўчора патэлефанавала ў прэс-службу Міністэрства замежных спраў Украіны. «Украінскі бок з усёй сур'ёзнасцю паставіўся да інцыдэнту. У цяперашні момант працягваецца расследаванне», — паведамілі там.

Дэпутат Дзмітрый ШАЎЦОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, выказаў нашай газеце сваё меркаванне наконт «інцыдэнту»:

— У гэтай сітуацыі нашы пілоты зрабілі выключна правільна. Ні ў якім разе нельга ставіць пад пагрозу жыццё іншых грамадзян, якія знаходзяцца ў самалёце. Тое ўказанне, якое перадаў дыспетчар, экіпаж нашага самалёта трактаваў дакладна. Іншае пытанне, які пасыл. Гэта вельмі абуральны крок, калі пад пагрозай узлёта баявых самалётаў разварочваецца пасажырскі самалёт. Пакуль, на жаль, афіцыйных тлумачэнняў, выбачэнняў ад украінскага боку мы не пачулі. Але, думаю, гэты канфлікт у любым выпадку будзе вырашаны. І ў далейшым мы даведаемся аб'ектыўную прычыну ўсяго, што адбылося.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

КАРАТКА

У Беларусі з 1 лістапада ўстаноўлены памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў. МСБ на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек з 1.11.16 па 31.01.17 г. у разліку на месяц складае BIN293,32 (раней — BIN285,43). Новы МСБ павысіўся на 2,8% да папярэдняга.

У Ханоі з'явіцца зборачныя вытворчасці пасажырскай і грузавой тэхнікі МАЗ з гадавой вытворчай магутнасцю 1,5 тыс. адзінак.

Міністэрства фінансаў з 1 лістапада паніжае цэны на каштоўныя металы ў выразах і ломе, што скупляюцца ў фізічных асоб (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб).

МУС унесла ў Савет Міністраў праект указа па абмежаванні продажу алкаголю.

Беларускі футбольны турнір «Надзея» прызнаны Еўрапейскім саюзам футбольных асацыяцый (УЕФА) лепшым сацыяльным праектам па выніках сезона 2015/2016.

■ Набалелае

СЁННЯ ЁН ЯЕ ПАБІЎ, А ЗАЎТРА НЕ РАЗЛІЧЫЎ СІЛЫ...

Як вырашыць праблему сямейна-бытавога насілля

Па статыстыцы, да 30% зарэгістраваных забойстваў адбываецца ў сям'і, пры паўсядзённых абставінах. Гэта не паддаецца звычайнай логіцы, бо людзі гінуць ад рук сваіх самых блізкіх, тых, з кім, здавалася б, лёс звязаў узаемным каханнем, любоўю, адданасцю і падтрымкай. Як правіла, да трагедыі прыводзіць канфлікт, які цягнецца гадамі. Часта пра штодзённыя скандалы, высвятленне адносін з дапамогай грубай фізічнай сілы ў канкрэтнай сям'і ведаюць і калегі, і сваякі, і суседзі, і работнікі праваахоўных органаў, але не ўмешваюцца.
Такой пазіцыі можна знайсці тлумачэнне: у адносінах паміж мужам і жонкай, старымі бацькамі і дарослымі дзецьмі чужому чалавеку цяжка разабрацца. Прычыны сварак хаваюцца ў сутыкненні інтарэсаў, розных поглядах на мараль, у розным бачанні свету і жыццёвым вопыце. Нярэдка

каталізатарам трагедыі выступае алкаголь.
У сямейных катастрофах часта мае месца правакацыя, і самая распаўсюджаная ахвяра тут — жонка. Сямейныя і бытавыя злачынствы не маюць ні нацыянальнасці, ні ўзросту.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ЗАСЛУЖАНАЕ ПРЫЗНАННЕ — ПРАФЕСІЯНАЛАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адна з узнагароджаных у галіне аховы здароўя — **галоўны ўрач дзіцячай паліклінікі №1 горада Гродна Ірына ЛУКАНСКАЯ**, якая калісьці пачынала ў гэтай установе сваю работу ў якасці ўчастковага доктара. Цяпер Ірына Луканская пераканана, што ўзнагарода належыць усяму калектыву паліклінікі, а дзеці ў Беларусі — самыя лепшыя. «Сітуацыя па здароўі дзяцей у нас стабільная. З кожным годам становіцца ўсё больш цалкам здаровых. Хоць, на жаль, існуе тэндэнцыя, калі дзіця шмат займаецца дома, у школе, няправільна сядзіць, дрэнна асвятляецца яго працоўнае месца, тады ўзнікаюць так званыя школьназалежныя захворванні, якіх, хацелася б, каб было менш. Наша задача як супрацоўнікаў сістэмы аховы здароўя — захаваць здароўе нашых дзетак для таго, каб у іх была магчымасць спраўдзіць усе свае мары і імкненні», — лічыць галоўны ўрач.

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў дасягненні работнікаў сферы культуры. Сярод іх і **Валянціна ГАЯВАЯ, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі»**, якая тыдзень таму адзначыла 80-гадовы юбілей. Яна прызналася, што ўзнагарода для яе — нечаканасць. Пры гэтым мастацкі кіраўнік расказала, што цяпер працуе як ніколі. «Калі мяне не стане, ансамбль абавязаны жыць. Зараз гэта мая галоўная задача. Адным пераемнікам не абыдзешся. Пераемнасць мусіць быць ва ўсім: ад артыстаў, музыкаў, мастака да адміністрацыйнага персаналу, — лічыць Святлана Гаявая. — У той час, калі сусветна вядомыя зоркі адмяняюць канцэрты з-за адсутнасці гледачоў, у нас аншлагі. Мы вельмі ўдзячны за гэта нашым гледачам. Чаму так? Мяркую, хваля цікавасці да сучасных, папулярных танцаў спадае. Ужо наеліся. Хочацца свайго, роднага, беларускага».

Дзяржаўныя ўзнагароды атрымала вялікая колькасць леснікоў. Галоўны ляснічы, першы **намеснік генеральнага дырэктара Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Аляксандр ВАСІЛЕНКА** яшчэ школьнікам зацікавіўся лесам, а ў 1983 годзе пачаў працаваць лесарубам. Атрымліваецца, у прафесіі — больш за 30 гадоў. «Лясная гаспадарка — досыць кансерватыўная галіна. Але апошнія гады заўважна ўкараненне новых тэхналогій, механізацыя замяняе ручную працу на загатоўках, з'яўляюцца новыя тэхналогіі вырошчвання лесу, — расказвае галоўны ляснічы. — Я нядаўна быў у камандзіроўках у Фінляндыі і Германіі, і хачу сказаць, што ў нас работа з лясамі арганізавана не горш, чым у гэтых краінах».

Узнагарод удастоены і прадстаўнікі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, трэнеры, супрацоўнікі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, кіраўніцтва Беларускага радыё, прадстаўнікі Міністэрства эканомікі.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

СУБОТНІ ЗВАНОК

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы 5 лістапада выйдуць на традыцыйную прамую сувязь з жыхарамі краіны. З 9.00 да 12.00 на пытанні будуць адказваць:

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

Мінскі аблвыканкам
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

Мінскі гарвыканкам
першы намеснік старшыні КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч (80172224444).

■ Будзе свята!

Навагодняе дрэўца вас ужо чакае

Да Новага года яшчэ далёка, а лясгасы краіны распачалі падрыхтоўку да яго.

У Міністэрстве лясной гаспадаркі вызначылі, што сёлета зімовыя святы суайчыннікаў могуць упрыгожыць 115 тысяч навагодніх дрэўцаў. Менавіта столькі падрыхтавалі лясгасы да рэалізацыі насельніцтву. Дрэўцы для зімовых свят яны вырошчвалі на спецыяльных плантацыях. У сістэме Мінлясгаса плошча такіх складае больш за 642 гектары. На іх расце амаль два мільёны елачак. На леташніх святах лясгасы рэалізавалі больш за 143 тысячы навагодніх дрэў, у тым ліку 888 — у кадках. Навагодніх букетаў тады было прададзена 3,6 тысячы штук.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
8 декабря 2016 года проводит
14-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
204	Седельный автотягач КамАЗ-54112 ш. ХТС541120К0021137 дв. 0418815 1989 г. *2 кат. 23617 км*	п. Валерьяново Минский р-он	8 500,00	850,00
205	Седельный автотягач КамАЗ-54112 ш. ХТС541120К0021454 дв. 0425521 1989 г. *2 кат. 1366 км*	п. Валерьяново Минский р-он	9 000,00	900,00
206	Кузов-фургон К1.37 № 060935 1983 г. *2 кат.* Автошасси УРАЛ-375 АМ ш. 401547 дв. 908122 1983 г. *3 кат. 2397 км*	г. Барановичи в/ч 97047	7 200,00	720,00
207	ТЗ-22М (топливозаправщик) без тележки с/о А773320 на - КрАЗ-258Б1 ш. 303809 дв. 472095 ЧМЗАП-5524П ш. 7512 дв. 117147 1977 г. *4 кат. 1 148 км*	н.п. Михановичи в/ч 52188	16 000,00	1 600,00
208	Перекачивающая станция горючего ПСГ-160(130)скл. с/оА5183 на ЗиЛ-130 ш. 2110892 дв. 887561 1983 г. *4 кат. 1 339 км*	н.п. Михановичи в/ч 52188	2 600,00	260,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **8 декабря 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 5 декабря 2016 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **8 декабря 2016 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли — р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли — р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662, Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by.**

■ Занятасць

«Заплачу́, калі знойдзеце мне работу»

Кадравыя агенцтвы будуць працаваць па новых правілах

Аказваць паслугі па працаўладкаванні дазволяць толькі ўключаным у рэестр кадравым агенцтвам, а плаціць за дапамогу рэкруцёрам будуць па факце. Гэта прапісана ў Пастанове Савета Міністраў №855, якая ўступае ў сілу з 1 студзеня 2017 года.

У дакуменце вызначаны спіс паслуг, якія будуць аказваць прыватныя агенцтвы. Напрыклад, складаць рэзюмэ, рыхтаваць саіскальніка да субяседавання, арганізоўваць работу па прафарыентацыі, каб дапамагчы выбраць прафесію ці курсы па перападрыхтоўцы. Рэкруцёры павінны будуць расказваць пра попыт і прапановы на рынку працы і даваць дакладную інфармацыю пра вакансіі і патрабаванні да кандыдатаў. Сярод паслуг таксама рассылка рэзюмэ работадаўцам, арганізацыя перамоў з наймальнікам, садзейнічанне ў падборы прыдатнага месца і афармленні працоўных адносін.

Прыватных кадравікоў абавяжуць складаць пісьмовы дагавор платнага аказання паслуг і даваць справаздачу аб колькасці грамадзян, якія звярнуліся да іх па садзейнічанне ў пошуку работы, і відах прадастаўленых паслуг па запыце Міністэрства працы і сацабароны.

Раней дзейнасць прыватных агенцтваў па працаўладкаванні не рэгламентавалася. Агульныя ж механізмы абароны правоў грамадзян пры прадастаўленні няякасных паслуг не заўсёды былі эфектыўнымі. Да таго ж агенцтвы не гарантавалі дакладнасць інфармацыі пра вакансіі: саіскальнікам даводзілася самім тэлефанаваць на прадпрыемствы, каб даведацца, які там заробак і ці існуюць увогуле тыя свабодныя месцы.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■

Не пакараць, а папярэдзіць

Не павінен — не плаці

Першапачаткова падатковыя органы збіраліся падлічыць усіх плацельшчыкаў падобнага збору да 1 жніўня і аператыўна накіраваць ім паведамленні, каб апошнія маглі разлічыцца з бюджэтам да 15 лістапада. Аднак хуценька не атрымалася.

Святлана Шаўчэнка расказала, што падатковыя органы і цяпер працягваюць работу па фарміраванні базы дадзеных плацельшчыкаў збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў за 2015 год. Пры гэтым вызначэнне перыяду ўдзелу грамадзян у фінансаванні дзяржаўных расходаў ажыццяўляецца на падставе звестак, якія ёсць у дзяржаўных органах і арганізацыях. «Аднак цалкам аўтаматызаваць працэс фарміравання такой базы па аб'ектыўных прычынах не атрымалася, бо многія грамадзяне, напрыклад, працуюць за межамі нашай краіны і аплачваюць падаткі на тэрыторыі замежных дзяржаў. Акрамя таго, многія беларускія студэнты вучацца за мяжой, а падобная інфармацыя таксама не захоўваецца ў базах дадзеных нашых дзяржорганаў. І спіс такіх сітуацый можна працягваць», — адзначыла яна. Таму бываюць выпадкі, калі чалавек дармаедам ніякім чынам не з'яўляецца, а яму прыходзіць паведамленне аб аплаце збору. Баяцца гэтага не трэба.

У такім выпадку трэба «прадставіць у падатковы орган дакументы або тлумачэнні, якія сведчаць аб адсутнасці ў яго абавязку па аплаце збору за адпаведны падатковы перыяд ці аб няправільным вылічэнні падатковым органам сумы збору». Інфармацыю аб гэтым можна прынесці ў падатковы орган асабіста або адправіць адпаведнае паведамленне праз размешчаны на сайце міністэрства сэрвіс «Электронны зварот», растлумачыла Святлана Шаўчэнка. Дарэчы, ужо больш за 11 тысяч грамадзян апавясцілі падатковыя органы аб праве на вызваленне ад аплаты збору.

Святлана Шаўчэнка нагадала, што інфармацыя аб катэгорыях грамадзян, якія вызваляюцца ад аплаты збору, і прыкладная форма дакумента аб наяўнасці права на вызваленне размешчана на сайце міністэрства ў раздзеле «Збор на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў». Пры гэтым спікер падкрэсліла, што падатковыя органы збіраюць звесткі аб занятасці людзей самастойна, але могуць звяртацца да грамадзян за ўдакладненнямі, калі атрымаць нейкую інфармацыю спецыялістам немагчыма.

Разгледзяць любую сітуацыю

Сёння ў падатковай інспекцыі існуе цэлы спіс катэгорый насельніцтва, якія вызваляюцца ад аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў. Гэта пенсіянеры, інваліды, шматдзетныя маці і тыя, хто выхоўвае дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, а таксама жанчыны, якія даглядаюць за дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў. Не трэба плаціць такі падатак і тым, хто летась быў на тэрыторыі краіны менш за 183 дні. А прысядзібны ўчастак пакуль што вызваляе ад аплаты падатку толькі жыхароў сельскіх населеных пунктаў і пасёлкаў гарадскога тыпу. У апошнім выпадку ўладальніку ўласных сотак неабходна будзе атрымаць даведку ад мясцовых улад аб факце і перыядзе вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі менавіта па месцы сваёй рэгістрацыі. Не павінны гэты збор плаціць індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўжо заплацілі ў казну па спрошчанай сістэме падаткаабкладання 360 і больш рублёў, рамеснікі, члены творчых саюзаў і іншыя нешматлікія катэгорыі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ужо больш за 11 тысяч грамадзян апавясцілі падатковыя органы аб праве на вызваленне ад аплаты збору.

Аднак, бываюць выпадкі, калі чалавек можа трапіць у сапраўды складаную жыццёвую сітуацыю, якая перашкаджае яму атрымліваць даходы і нават аплаціць гэты збор. Калі гэта сапраўды так, то грамадзяніна могуць вызваліць ад аплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў. Намеснік міністра адзначыла, што Дэкрэт №3 устанаўлівае агульныя падыходы да ўсіх плацельшчыкаў збору. Разам з гэтым неабходна ўлічваць кожную канкрэтную жыццёвую сітуацыю. Можа скласціся так, што чалавек па тых ці іншых прычынах трапляе ў лік плацельшчыкаў збору, але ў яго цяжкае фінансавае становішча, жыццёвыя абставіны. У гэтым выпадку прадугледжана магчымасць звароту ў мясцовыя органы ўлады з просьбай аб вызваленні ад аплаты збору. Таму тыя грамадзяне, якім будуць накіраваны паведамленні і ў якіх цяжкія фінансавыя абставіны, могуць звярнуцца ў мясцовыя органы ўлады з адпаведнай заявай, удакладніла Святлана Шаўчэнка.

Патэнт для самазанятых

Ідэя аб увядзенні патэнтнай сістэмы для самазанятасці знаходзіцца сёння ў стадыі абмеркавання, паведаміла намеснік міністра. Паводле яе слоў, пад тэрмінам «самазаняты чалавек» падразумеваецца той, хто самастойна займаецца нейкай дзейнасцю. «Гэта і прадпрымальнікі. Таксама ў нас ёсць катэгорыя асоб, якія займаюцца дзейнасцю па заяўным прынцыпе. Просты прыклад — рэпетытары, якія аплачваюць адзіны падатак і не вядуць ніякіх справаздач», — патлумачыла Святлана Шаўчэнка. Цяпер МПЗ і Мінэканомікі выступілі з ініцыятывай пашырыць пералік відаў дзейнасці, якімі можна займацца без рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка. Напрыклад, цяпер ідзе гаворка аб тым, каб да такога віду дзейнасці аднесці пашыў адзення па заказах грамадзян, дробны рамонт абутку і іншыя.

«Ёсць некалькі варыянтаў. Патэнт могуць атрымліваць індывідуальныя прадпрымальнікі, а могуць і асобы, якія з'яўляюцца самазанятымі», — лічыць яна.

Як паведамлялася, з ініцыятывай аб увядзенні патэнта на самазанятасць выступіў **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**. Паводле яго слоў, рэгістрацыя праз куплю патэнта на самазанятасць без пастаноўкі на ўлік у якасці беспрацоўных прастымулюе прадпрымальніцкую актыўнасць асоб, якія страцілі работу, доўгі час не працуюць, але ўцягнуты ў ценявую занятасць. На думку Міхаіла Мясніковіча, да самазанятых могуць быць аднесены асобы, якія працуюць па заяўным прынцыпе без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка — рамеснікі, супрацоўнікі сферы аграэкатурызму, уладальнікі асабістых падсобных гаспадарак, асобы, якія займаюцца прыбіраннем, бытавымі паслугамі. Міхаіл Мясніковіч лічыць, што кошт патэнта на самазанятасць можна наблізіць да памеру адзінага падатку.

Яшчэ тры гады «адтэрміноўкі»... у перспектыве

Зараз ад выплаты «падатку на дармаедства» вызвалены шматдзетныя маці і тыя, хто выхоўвае дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў. Але яшчэ ў снежні мінулага года кіраўніцтва падатковай галіны пачало ўносіць свае прапановы ў праект новага дакумента, дзе прадугледжваецца залічваць у якасці ўдзелу ў фінансаванні дзяржвыдаткаў аднаго з бацькоў перыяды выхавання ў сям'і дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў. Праект дэкрэта падрыхтаваны ўсімі зацікаўленымі органамі і праходзіць узгадненне. У першую чаргу ён закране інтарэсы жанчын, якія выхоўваюць дзяцей.

Разам з маці ў новым дакуменце ад падатку на дармаедства збіраюцца вызваліць і людзей, якія маюць асабістыя падсобныя гаспадаркі. «Да нас часта сталі звяртацца людзі, якія маюць зямельны ўчастак, што прызначаны для абслугоўвання жылога дома. Яны працуюць на гэтай зямлі, займаюцца раслінаводствам і не разумеюць, чаму павінны быць плацельшчыкамі збору», — тлумачыць сітуацыю намеснік міністра. Згодна з прапановай падаткавікоў, праца на падсобнай гаспадарцы будзе ўлічвацца для ўсіх катэгорый нашых грамадзян, а не толькі тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці. Таму актыўныя дачнікі, верагодна, таксама не будуць плаціць такі падатак. Спецыялісты падатковай сферы думаюць, што гэтыя новаўвядзенні будуць дзейнічаць ужо па выніках 2016 года.

Першы мільён

Сёння спецыялісты МПЗ адзначаюць, што больш за 4 тысячы беларусаў загадзя прызналіся ў сацыяльным утрыманстве, каб атрымаць 10-працэнтную зніжку на падатак. Такім людзям ужо налічылі 1 мільён 10 тысяч рублёў збору, якія былі пералічаны ў бюджэт. Самастойна гэта катэгорыя людзей магла паведаміць у падатковую інспекцыю да 31 мая аб тым, што яны нідзе не працавалі летась і не плацілі падаткаў, а аплаціць збор павінны былі не пазней за 1 ліпеня.

Згодна з падатковым заканадаўствам, усе астатнія плацельшчыкі збору на фінансаванне дзяржвыдаткаў павінны разлічыцца з бюджэтам да 15 лістапада. Паведамленні з прапановай аплаціць гэты збор людзі будуць атрымліваць і пасля гэтай даты. У такім выпадку пералічыць грошы неабходна будзе на працягу 30 дзён.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

БАРЫС ПРАКОПЧЫК. СЛОВА НА РАЗВІТАННЕ

Зусім хутка, праз некалькі месяцаў, мы павінны былі б віншаваць калегу Барыса Пракопчыка з 30-годдзем работы ў «Звяздзе», а сёння вось на 57-м годзе яго жыцця гаворым словы на развітанне. Які ж несправядлівы лёс, што вырывае людзей са строю ў самым творчым росквіце!

Барыс Георгіевіч Пракопчык прыйшоў у «Звязду» ў 1987 годзе ўласным карэспандэнтам па Гродзенскай вобласці. І ўсе гэтыя гады цікава, разнастайна і па-сучаснаму асвятляў жыццё рэгіёна. Яго канькам заўсёды была аналітыка, праблемныя рэпартажы і артыкулы. Журналіст Пракопчык умеў дакапацца да сутнасці і прапанаваць свой погляд на вырашэнне праблемы. Пры гэтым умудраўся не пакрыўдзіць сваіх герояў рэзкім словам альбо безапеляцыйнай высновай. Па натуры ён быў стваральнік, а не разбуральнік.

Барыс любіў людзей і свой Прынёманскі край. Столькі матэрыялаў за гэтыя гады ён прысвяціў прыгожым, знакавым мясцінам Гродзеншчыны! Асаблівую ўвагу надаваў развіццю турыстычнага патэнцыялу краю, на гэту тэму ў «Звяздзе» штогод выходзілі цэлыя серыі яго публікацый.

У жыцці ж Барыс Георгіевіч заўсёды заставаўся чалавекам сціплым, інтэлігентным. Мы ведалі яго як надзвычай людскага і кампанейскага таварыша. Калі збіраліся ўласныя карэспандэнты ў Мінску, менавіта ён выступаў ініцыятарам таго, каб прадоўжыць стасункі за кавай, абмяняцца думкамі і развагамі, пагаварыць пра сем'і і асабістыя справы. Барыс заўсёды вельмі цёпла і хораша згадваў сваю жонку, сына і дачку. Было відно, які ён уважлівы і клапатлівы сямейнік. Такім жа быў і з чужымі: добразычлівым, адкрытым.

За сваю працу Барыс Пракопчык не раз быў адзначаны рознымі ўзнагародамі. Сярод іх медаль Францыска Скарыны, знак «Выдатнік друку Беларусі». Былі б, несумненна, і новыя адзнакі...

Заўсёды будзем памятаць цябе, Барыс.

Звяздоўцы.

Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт і Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў глыбока смуткуюць з нагоды заўчаснай смерці спецыяльнага карэспандэнта газеты «Звязда» па Гродзенскай вобласці ПРАКОПЧЫКА Барыса Георгіевіча і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Сакратарыят Беларускага саюза журналістаў смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю спецыяльнага карэспандэнта газеты «Звязда», высокага прафесіянала сваёй справы ПРАКОПЧЫКА Барыса Георгіевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

■ Стыхія

ЦЫКЛОН GISI: МОЦНЫ СНЕГ І ДОЖДЖ РАЗАМ СА ШКВАЛІСТЫМ ВЕТРАМ

Сёння сіноптыкамі аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі

У сераду на тэрыторыю краіны завітае даволі магутны цыклон з «прапіскай» над Балтыйскім морам, які далей будзе рухацца на ўсход кантынента. Таму прагназуецца істотнае пагаршэнне надвор'я, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Уначы на 2 лістапада моцныя ападкі (снег, мокры снег і дождж) пагаспадарылі ў заходніх і цэнтральных раёнах, а раніцай і ўдзень такі сюрпрыз ад «маладой» зімы чакае і ўсходніх раёны краіны. У асобных рэгіёнах Беларусі магчыма наліпанне мокрага снегу, на дарогах — галалёдзіца. Раніцай і ўдзень па ўсходзе месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру з парывамі да 15—18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да плюс 6, а па паўднёвым захадзе — да плюс 9 градусаў.

У сталіцы моцны снег з дажджом прайшоў уначы на сераду, але і ўдзень тут сіноптыкі абяцаюць моцны мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж. Дождж і мокры снег чакаюцца і ў чацвер. У асобных раёнах прагназуецца слабы галалёд, а ўначы і раніцай туман. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 1 да 5 градусаў цяпла. Толькі ў пятніцу надвор'е крыху супакоіцца, калі паўсюдна пройдзе толькі невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Аднак пахаладае, бо да нас з боку поўначы Еўропы завітае чарговая порцыя арктычнага паветра. Тэмпературны фон на працягу сутак будзе вагацца ад 5 марозу да 5 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

СЁННЯ ЁН ЯЕ ПАБІЎ, А ЗАЎТРА НЕ РАЗЛІЧЫЎ СІЛЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У цэнтральным рэгіёне за 9 месяцаў гэтага года на глебе сямейна-бытавых канфліктаў адбылося 11 забойстваў, зарэгістравана 22 цяжкія цялесныя пашкоджанні. Летась за гэты ж час — адпаведна 16 і 19. Прычым значная частка іх зарэгістравана ў Маладзечанскім (6), Мінскім (5), Пухавіцкім (4) і Дзяржынскім (3) раёнах, — расказвае **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Уладзімір НЕПАКУПНЫ**. — За насілле ў адносінах блізкіх сваякоў, членаў сям'і да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 2588 грамадзян (120,6% да мінулагодняга перыяду).

Разам з тым многія сямейна-бытавыя злачынствы можна было б папярэдзіць.

— Парушаецца галоўны прынцып прафілактыкі — індывідуальная работа, — упэўнены памочнік пракурора. — Многія злачынствы можна было б прадухіліць, калі б больш кантактавалі паміж сабой і кантралявалі работу сваіх супрацоўнікаў службы аддзелаў унутраных спраў.

Напрыклад, страшны выпадак адбыўся ў жніўні ў гандлёвым цэнтры Фаніпаля, дзе былы муж нанёс жонцы 44 нажавыя ўдары. Ён доўга пераследаваў яе. Жанчына вымушана была хавацца. Яна неаднойчы звярталася з заявамі ў міліцыю, прасіла абараніць яе. Але будучага забойцу нават на 15 сутак не пасадзілі, гутарылі з ім і... адпускалі. Па гэтым факце Мінская абласная пракуратура арганізавала праверку, дадаткова ўзбуджаны дзве крымінальныя справы аб пагрозе забойствам і ўнесена прадстаўленне начальніку ўпраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкама з патрабаваннем прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

— У Мінскай вобласці дзейнічае праграма па прафілактыцы правапарушэнняў, а таксама аналагічныя рэгіянальныя праграмы. У іх уключаны раздзел, які тычыцца насілля ў сям'і, быце. Дакументы прадугледжваюць разнастайныя мерапрыемствы, акцыі па азначанай праблеме, — кажа Уладзімір Непакупны. — Пракуратура пастаянна адсочвае іх эфектыўнасць і своечасовае выкананне. Акрамя таго, у кожным раёне і горадзе Жодзіна створаны крызісныя пакоі, якія даюць прытулак тым, хто пакутуе ад хатняй тыраніі.

Асноўная праблема чалавека, які сутыкаецца з сямейным насіллем, — пошук месца, дзе можна прытуліць галаву. Гэта дае магчымасць атрымаць перадышку, прыйсці ў сябе, падумаць і, магчыма, пачаць жыццё з чыстага ліста. Але многім ахвярам цяжка прыняць рашэнне і пайсці ад тырана. Прычын тут шмат: матэрыяльная, псіхалагічная, жыллёвая. Жанчыны, як правіла, шукаюць апраўданне: маўляў, баюся, каб дом не спаліў, дзецям адсюль блізка да школы...

Крызісны пакой для ахвяр насілля ў Мядзеле.

«Многія злачынствы можна было б прадухіліць, калі б больш кантактавалі паміж сабой і кантралявалі работу сваіх супрацоўнікаў службы аддзелаў унутраных спраў».

— Мы прыкладаем намаганні, каб пацярпелая хаця б начавала ў прытулку. У 2015 годзе крызіснымі пакоямі скарысталіся толькі 32 чалавекі. У Бярэзінскім, Вілейскім, Дзяржынскім, Крупскім, Лагойскім, Любанскім, Мядзельскім, Нясвіжскім, Смалявіцкім, Старадарожскім, Стаўбцоўскім і Уздзенскім раёнах — ніводнага. Напрыклад, спецыялісты Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва летась працавалі з трыма пацярпелымі ад сямейнага насілля. Але яны адмовіліся ад часовага пражывання ў крызісным пакоі ў сувязі з пераездам да сваякоў, прымірэннем з крыўдзіцелем, нежаданнем пакідаць хатнюю гаспадарку, па асабістых матывах. Усяго ж тэрытарыяльнымі цэнтрамі Міншчыны зафіксавана 76 адмаўленняў.

Аб фактах здзейсненага насілля павінны паведамляць у структуры прафілактыкі і арганізацыі аховы здароўя. Аднак, як паказваюць вынікі пракурорскіх праверак, у большасці густанаселеных раёнаў гэтыя патрабаванні не выконваюцца. А менавіта ў Барысаўскім, Мінскім, Маладзечанскім, Слуцкім, Пухавіцкім, Смалявіцкім. Ніводнай заявы на гэты конт не паступіла з установы Капыльскага, Любанскага, Старадарожскага, Стаўбцоўскага раёнаў.

— Станоўча дзейнічае на дэбашыраў і вынясенне абаронных прадпісанняў, — лічыць Уладзімір Непакупны. — Такая магчымасць з'явілася пасля ўступлення ў сілу 16 красавіка 2014 года Закона «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». Паводле яго, сямейнаму скандалісту неабходна пакінуць жыллё, яму забараняецца на працягу 30 дзён наведваць сям'ю, спрабаваць выясняць, дзе знаходзіцца жонка. Вядома, сам факт вынясення прадпісання кардынальна не зменіць характар, але прымусіць задумацца над сваімі ўчынкамі. Тым больш што злосныя парушальнікі сямейнага пакою адначасова ставяцца на прафілактычны ўлік, пасля чаго з імі штомесяц праводзіцца прафілактычная работа.

Сямейных тыранаў не выганяюць на вуліцу, у рэгіёнах для іх створаны крызісныя пакоі. Але не ўсіх задавальняюць тамтэйшыя спартанскія ўмовы. І яны кватаруюць, як правіла, у блізкіх, сваякоў. Калі дэбашыр парушае патрабаванні, то да яго прымяняюцца меры адміністрацыйнага характару. Такія факты адзінкавыя, але ёсць. Пракуратура кантралюе, каб міліцыя іх адсочвала. За 9 месяцаў гэтага года колькасць абаронных прадпісанняў, вынесеных раённымі аддзеламі ўнутраных спраў Мінскай вобласці, павялічылася са 115 да 510.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

2 лістапада 2016 г. № 18 (381)

КАПЕЙКА ДА КАПЕЙКІ

ЖЫЦЬ УЛАСНЫМІ ДАХОДАМІ

Як недатацыйныя раёны плануюць свой бюджэт

Надзея АНІСОВІЧ

Пераважная большасць раёнаў нашай краіны з'яўляюцца датацыйнымі. Рэдкасць, калі бюджэт тэрытарыяльнай адзінкі збалансаваны і людзі там жывуць па сродках. У 2017 годзе з рэспубліканскага бюджэту будзе выдзелена 2 275,8 млн рублёў на датацыі абласцям Беларусі. (Гэта 102,8% да лічбы бягучага года.) Але ёсць шчаслівыя выключэнні. Яўгенія ЛІПНІЦКАЯ, начальнік фінансавага аддзела Дзяржынскага райвыканкама, расказала, адкуль бяруць грошы і як іх траціць у раёне, які зарабляе сабе на жыццё самастойна.

Звесці дэбет з крэдытам

— Асаблівасць бюджэту Дзяржынскага раёна — стварэнне дастаткова ўстойлівай даходнай базы, — расказвае Яўгенія Ліпніцкая. — З аднаго боку, плацельшчыкамі падаткаў з'яўляюцца ўсе нашы прамысловыя прадпрыемствы, з другога — у нас вельмі вялікі недзяржаўны сектар. Нашы даходы і расходы збалансаваны (зарабляем і трацім па 65 млн рублёў). Дапамогу з вобласці мы атрымліваем не ў выглядзе датацый, а субвенцыямі на пэўныя віды выдаткаў, напрыклад на вапнаванне глебы, на іншыя мерапрыемствы, якія рэспубліка ці вобласць фінансуе. Жывём уласнымі даходамі.



Вельмі добрая прамысловая база створана ў Фаніпалі. Асноўным плацельшчыкам падаткаў у раёне з'яўляецца агракамбінат «Дзяржынскі». Яго доля ў даходах 6,5%. Далей ідуць прадпрыемствы рэспубліканскай формы ўласнасці. У рэспубліканскі бюджэт яны плацяць падатак на дабаўленую вартасць і на прыбытак, а астатнія падаткі, у тым ліку падаходны, — у бюджэт раёна. Другім па ўдзельнай вазе плацельшчыкам з'яўляецца РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт» у Фаніпалі. Там жа знаходзяцца іншыя буйныя прадпрыемствы, прыбытак ад якіх складае каля 3% раённага бюджэту.

Адзін з «сакрэтаў» развіцця Дзяржынскага раёна — вялікая колькасць прыватных прадпрыемстваў. Здаецца, прычына відавочная — побач сталіца, але магчымасці рэгіёна актыўна развівае і мясцовая ўлада, расказвае наша суразмоўніца:

— Трэба ствараць спрыяльнае асяроддзе для таго, каб прыцягваць бізнес. У нас добрыя транспартныя зносіны. Прадпрымальнік можа асабіста звярнуцца да старшыні раёна з прапановай. Праз аўкцыёны ўчасткі прадаюцца толькі пад гандаль, а пад вытворчасць зямля можа вылучацца і наўпрост. Калі гэта раёну выгадна і ёсць добры бізнес-план, то даём месца для размяшчэння вытворчасці.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Старшы інспектар Юрый ДАНІЛЮК з пенсіянеркай Вольгай БАЛАБУШКАЙ.

ПАЕХАЛІ!..

АПАВЯШЧАЛЬНІК БЕЗ БАТАРЭЙКІ І ЛІЧЫЛЬНІК «З ЖУЧКОМ»

Рэйды супрацоўнікаў сельвыканкамаў і інспектараў супрацьпажарнага нагляду МНС звычайна выяўляюць сацыяльныя праблемы

Святлана ЯСКЕВІЧ

Па вёсках Слаўнае, Стасюкі, Вострава старшыня Тэвельскага сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА накіравалася з інспектарамі нагляду і прафілактыкі Кобрынскага райаддзела МНС Андрэем КРЫЎЦОМ і Юрыем ДАНІЛЮКОМ. Іх мэтай было наведаць адзінокіх грамадзян і тых, якія пражываюць адны. Карэспандэнт «МС» напрасілася з імі ў рэйд.

«Жучок» — сваяк пажару

Варта сказаць, што ў 21 населеным пункце сельсавета жывуць 30 адзінокіх грамадзян і 196 тых, хто пражывае адзін. І ўсіх з наступленнем ацяпляльнага сезона трэба наведаць, паглядзець, у якім стане печы, праводка, ці спраўныя аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, ці няма так званых «жучкоў» у электралічыльніках. Ну і, вядома, выпадае нагода пагаварыць з людзьмі, папытаць, што іх турбуе. Трэба адзначыць, што большасць пажылых пенсіянераў на развітанне казалі нам: «Дзякуй, што зайшлі ў хату, праведалі».

Заўважу, што ў большасці пажылых вяскоўцаў жыллё падрыхтавана да ацяпляльнага сезона як след: печы адрамантаваныя і пафарбаваныя, праводка падтрымліваецца ў належным стане, лічыльнікі нядаўна мянялі. Работа, якая вядзецца гадамі, дае свае вынікі. У некаторых хатах службовым асобам заставалася толькі праверыць, як выконваліся ранейшыя прадпісанні, альбо сапраўды праведаць гаспадароў і ўпэўніцца, што ўсё ў парадку.

Як сказала нам Вольга Балабушка з вёскі Слаўнае: «Толькі п'яніцы, якія курацъ у ложку, гараць, а сталыя людзі сочаць за сваім жытлом». З Вольгай Аляксееўнай не пагадзіўся старшы інспектар Юрый Данілюк і напомніў, што пільнасць і клопат пра бяспеку павінны быць ва ўсіх і заўсёды. І хоць значных парушэнняў у гэтай гаспадыні не заўважана, на будучае ёй варта паклапаціцца аб новай праводцы: старыя правады на роліках аджываюць свой век. Свае прапановы супрацоўнік МНС пісьмова выкажа дзецям вясковай жыхаркі.

У іншых хатах выяўлены большыя праблемы. Аказваецца, «жучкі» ў лічыльніках электраэнергіі — гэта не такая ўжо і рэдкасць у XXI стагоддзі. «Жучком» у народзе называюць самаробнае прыстасаванне з дроту, якое ўстанаўліваюць замест засцерагальніка ў прыбор падліку энергіі. Апошні ў выпадку кароткага замыкання ці моцнага перападу напружання спыняе паступленне току, а той самы дроцік, наадварот, яму спрыяе. Вось і лічыце, што «жучок» — найбліжэйшы сваяк пажару. Зусім не чакалі мы знайсці такое крымінальнае прыстасаванне ў доме 78-гадовай Марыі Апанасаўны...

Па дарозе старшыня сельвыканкама расказала прыгожую гісторыю, як сышліся ў адну хату два даволі пажылыя чалавекі, як падтрымліваюць адно аднаго. У дом да Марыі Апанасаўны з суседняй вёскі пераехаў мужчына, але паводле дакументаў яна лічыцца ўсё роўна адзінокай. Калі прыехалі да гаспадыні, то ўбачылі, як цяжка ёй жывецца. Жанчына нядаўна перанесла інсульт і амаль не ходзіць. Каб не яе сябар і памочнік, то самастойна не здолела б нават паесці прыгатаваць.

Печы ў доме аказаліся ў парадку. А вось «жучок» у лічыльнік... нібыта сам запоўз. Мужчына адразу адхрысціўся: маўляў, дом не мой, нічога не ведаю, гаспадыня з двума кійкамі і пагатоў не магла нешта зрабіць з прыборам...

Супрацоўнік МНС Андрэй Крывец зазначыў, што з такой сітуацыяй — калі людзі пачынаюць пераконваць, што яны не ведаюць, хто ўсталяваў забароненыя прыстасаванні, сапсаваў АПА ці яшчэ нейкім чынам нашкодзіў, — сутыкаецца часта. Давесці ім, што гаспадар домаўладання нясе адказнасць за ўсё, што знаходзіцца ў доме і на ўчастку, бывае вельмі няпроста.

Пацвярджэнне слоў спецыяліста выратавальнай службы чакала нас у наступнай хаце. Ва Уладзіміра Амельчука не працаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які ў пакоі пенсіянера ўстанавілі за сродкі бюджэту. Думалі, што трэба памяняць элемент сілкавання. Але аказалася, што правады, якія вядуць да той самай батарэйкі, акуратна перарэзаны. Гэта значыць, прыбор канчаткова сапсаваны.

Андрэй КРЫВЕЦ прымацоўвае апавяшчальнік у доме адзінокай вясковай жыхаркі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ:

«У ГРАМАДЗЯН ДРОБНЫХ ПРОСЬБАЎ НЕ БЫВАЕ»

У яго шафе ўсе дакументы скрупулёзна раскладзены па папках: «Еўразійскі эканамічны саюз», «Усебеларускі сход», «Пастаянная камісія» і... «Добрыя справы». У апошняй сабраны звесткі не пра дабрачыннасць, як можа падацца на першы погляд, а пра работу ў рэгіёне. Дакладней, канкрэтныя справы, у якіх атрымалася дапамагчы грамадзянам, што звярнуліся да сенатара. Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ў пятым і шостым скліканнях, член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы, быў вылучаны ад Краснапольскага, Чэрыкаўскага, Касцюковіцкага і Чавускага раёнаў Магілёўскай вобласці. І за чатыры гады работы ў верхняй палаце папка «Добрыя справы» стала поўная.

«Спектр зваротаў ад людзей не ўкладваецца ні ў адзін рамачны фармат, — дзеліцца сваімі думкамі Уладзімір Панцюхоў. — Часам яны бываюць папросту нечаканымі. На пытанне, чаму звяртаецеся менавіта да мяне, часцей за ўсё адказваюць: «Нам сказалі, што вы можаце дапамагчы і не адмовіце ў гэтым». Таму зваротаў як у пісьмовай, так і ў вуснай форме хапае. Некаторыя нават праз Viber лістуюць, я ўжо не кажу пра электронную пошту... Для мяне важна, каб словы падмацоўваліся справамі: сказаў — зрабі, узяўся — даводзь да канца. Тое, што мяне і ў гэтым скліканні выслучылі ў члены Савета Рэспублікі, — праява даверу і доказ таго, што гэты прынцып працуе».

Уладзімір Панцюхоў паставіў сабе мэту: вырашыць як мінімум адно глабальнае пытанне для кожнага з чатырох давераных яму раёнаў. Як прызнаецца сенатар, самы блізкі для яго — Чавускі. «Хоць люблю, безумоўна, і астатнія не менш», — усміхаецца ён. Але менавіта ў гэтым раёне Уладзімір Іванавіч атрымаў званне «Ганаровага грамадзяніна». «Сёння я працую над тым, каб прыцягнуць сродкі бюджэту Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі для будаўніцтва Чавускай лыжароленай трасы. Некалькі гадоў таму яно распачалося, але з прычыны слабага папаўнення раённага і абласнога бюджэтаў і немагчымасці далейшага фінансавання зараз гэты аб'ект замарожаны. Але традыцыі біятлону ў гэтым і Чэрыкаўскім раёнах дужа моцныя. Адтуль пайшлі прызёры чэмпіянатаў свету і алімпіяд у гэтым відзе спорту. У мясцовай школе-інтэрнаце шмат дзяцей, якія займаюцца хакеем, цяжкай атлетыкай і біятлонам, уваходзяць у склад зборных нашай рэспублікі», — кажа сенатар. Будаўніцтва адпаведнага спартыўнага комплексу дазволіла б правадзіць не толькі абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы, але і міжнародныя.

У Чэрыкаўскім раёне надзённае, набалелае пытанне — будаўніцтва лазнева-аздараўленчага комплексу. Лазня ўжо ёсць, але за гады існавання яна страціла першапачатковы выгляд і мае вялікую колькасць праблем. У Касцюковіцкім раёне работа вядзецца над тым, каб збудаваць нармальны морг. На жаль, той, што існуе, не адпавядае нормам. «Мы павінны з павагай ставіцца да тых, хто пайшоў з жыцця, — перакананы парламентарый. — І пытанне аб такога кшталту будаўніцтве стаіць нароўні з узвядзенем спартыўна-забаўляльных устаноў». Як, напрыклад, будаўніцтва другой чаргі аздараўленчага цэнтра з басейнам у Краснаполлі, горадзе, які пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы больш за ўсе навакольныя раённыя гарады. Да гэтага раёна ў сенатара асабліва цёплае стаўленне. «Калі прыязджаю да іх, стараюся падчас асабістых сустрэч прачытаць тое, што б іх кранула, развесяліла, узбадзёрыла. І краснапольцы адказваюць узаемнасцю: заўжды чакаюць у госці», — кажа ён.

Усе чатыры раёны адносяцца да так званых «чарнобыльскіх». Таму ўсе структуры, і асабліва ўлады, працуюць над тым, каб жыццё там было максімальна камфортным. «Але наша задача — не толькі падтрымаць тых, хто жыве ў гэтых раёнах, але і прывабіць у іх новых жыхароў. Няхай гэта будзе малады беларус, які прыедзе і будзе ўпэўнены, што яго чакаюць дастойнае месца працы, магчымасць атрымаць добрае жыллё для сваёй сям'і. Такім чынам мы не толькі падтрымаем існуючае, але і дадзім новае дыханне рэгіёну», — лічыць ён.

> Для выбаршчыка сапраўды важнае пытанне — тое, што адбываецца побач з ім: чысціня на вуліцы, гарачая вада, своечасова выплачаная зарплата.

У Савеце Рэспублікі за сенатарам замацоўваюць пэўны рэгіён. Для Уладзіміра Панцюхова — гэта Магілёўская і Гродзенская вобласці. Таму звяртаюцца да сенатара і адтуль. Просьбы ў грамадзян самага рознага кшталту: замяніць ацяпляльны комплекс, дапамагчы з размеркаваннем пасля заканчэння ВНУ, дабудаваць культурна-аздараўленчы цэнтр (гэта тычыцца Касцюковіцкага раёна). Апошняе зараз здзяйсняецца, і, магчыма, ужо хутка мы зможам быць на яго адкрыцці. «Неаднаразова да мяне звярталіся Саветы ветэранаў. Гэтым разам ветэраны з Чавус папрасілі дапамагчы набыць стол для настольнага тэніса», — дзеліцца парламентарый.

Але асноўная праца Уладзіміра Панцюхова як сенатара і старшыні камісіі — заканатворчая. «Людзям не вельмі цікава тое, чым мы займаемся ў асноўным, — законы. Для выбаршчыка сапраўды важнае пытанне — тое, што адбываецца побач з ім: чысціня на вуліцы, гарачая вада, своечасова выплачаная зарплата. І калі ў параўнанні з глабальным гэта падаецца дробяззю, то для чалавека — якраз наадварот. Яго пытанне — самае актуальнае. Задача сенатара не ў тым, каб разважаць наконт гэтага, ён павінен перш за ўсё дапамагчы чалавеку вырашыць яго праблему як мага хутчэй».

Уладзіміра Панцюхова ў найбліжэйшы час чакае праца не толькі з грамадзянамі, але і ў пастаянных камісіях Савета Рэспублікі, краін СНД і Саюзнай дзяржавы: «З мінулым складам камісіі Савета Рэспублікі развіваўся са слязьмі на вачах. За чатыры гады работы мы сталі адно аднаму амаль як родныя. Што тычыцца новых членаў нашай камісіі, то гэта прафесіяналы сваёй справы, выдатныя кіраўнікі, якія перакананы, змогуць зрабіць свой унёсак у заканатворчы працэс».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

САМІ ДЛЯ СЯБЕ

ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА

як альтэрнатыва клубу

У Шклоўскім раёне ініцыятыву ў свае рукі ўзялі жыхары

Калісьці на тэрыторыі Каменналаўскага сельсавета існаваў калгас «Зара». Гаспадаркі ўжо няма, але зямля па-ранейшаму дагледжана, на фермах гадуецца жывёла, з пастаўкамі мяса і малака праблем ніякіх. Ды і вёскі не выглядаюць кінутымі. Наадварот. Дзяцей столькі, што жыхары выходзяць самастойна будаваць гульнявыя пляцоўкі для іх. І робяць гэта з добрым настроем і крэатывам. У вёсцы Вялікая Камароўка такую пляцоўку адбудавалі, што нават дэпутат з Чавускага раёна пазайздросціў. Па-добраму, вядома ж. Нават у наш карпункт патэлефанаваў, каб карэспандэнт абавязкова наведала яе і ўсім расказала.



Гэту альтанку ўпрыгожвала Ірына БАРЫСАВА.

Канулы ў лету калгас «Зара» з поспехам замяняюць фермеры. Вёску Новыя Комсінічы апякае Аляксандр Канавалаў, Новую Вадву — Аляксандр Уласік, Старую Вадву — бацька з сынам Аляксандр і Сяргей Казначэевы, Цвыркава — Віктар Дунаеў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АБМЯРКУЕМ!

ЦІ БЫЦЬ ХРАМУ?

Каму перашкаджае яшчэ не ўзведзеная святыня

Аляксандр ПУКШАНСКІ

У Віцебску, як кажуць, тэмай №1 для «абмеркавання на кухнях» стала перспектыва ўзвядзення праваслаўнага храма ў парку па вуліцы Чэхава. Там задумалі пабудаваць копію знакамітай полацкай Сафіі — такой, якой яна была першапачаткова. Але нямала гараджан супраць. Лісты са скаргамі накіроўваюцца ў гарвыканкам і вышэй. У інтэрнэце тысячы людзей выказалі незадаволенасць. У чым сутнасць праблемы і як яна вырашаецца? Гэта высвятляў карэспандэнт «МС».

У ціхім парку...

Некалькі гадоў таму кіраўнікі мясцовай улады агучылі ідэю вернікаў, якая адразу стала абмяркоўвацца: бераг Заходняй Дзвіны можа ўпрыгожыць копія Сафійскага сабора. Падкрэслівалася, што на храм бюджэтныя грошы выкарыстоўвацца не будуць...

Сафійскі сабор у Полацку быў пабудаваны ў XI стагоддзі. І ён стаў трэцяй Сафіяй. У Кіеве Сафійскі храм быў закладзены ў 1037 годзе, у Ноўгарадзе — прыблізна ў 1045-м. Полацкі разбурылі ў 1710 годзе, а ў сярэдзіне XVIII стагоддзя аднавілі.

На думку аўтараў ідэі будаўніцтва ў Віцебску, храм стане сімвалам братэрства ўкраінскага, рускага і беларускага народаў. Безумоўна, у іх агульныя гістарычныя карані, яднае і хрысціянская вера. У наш час тром народам, як ніколі раней, патрэбна ўзаемаразуменне.

Блаславіў будаўніцтва і Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі — прадстаяцель РПЦ. Адпаведныя словы ёсць на пашпарце аб'екта — на агароджы будаўнічай пляцоўкі.

Настаяцель будучага храма айцец Міхаіл не раз нагадваў храналогію падзей. Адпаведная інфармацыя ёсць на сайце Віцебскай епархіі. У год 2000-годдзя ад Раства Хрыстова прынялі рашэнне аб будаўніцтве храма. Ініцыятары былі ўпэўненыя, што храм упішацца ў комплекс гістарычнай забудовы. Побач — помнікі архітэктуры, пешаходная зона...



Так, мяркуецца, будзе выглядаць храм.

Падчас абмеркавання прадстаўнікі ўлады сустрэліся з незадаволенымі.

Святы Сінод Беларускай праваслаўнай царквы ўхваліў узвядзенне сабора. Рашэнне зацвердзіў і Святы Сінод Рускай праваслаўнай царквы пад старшынствам Патрыярха Кірыла...

Наконт таго, чаму выбралі месца пад будаўніцтва менавіта ў ціхім парку. Як сцвярджаюць афіцыйныя асобы гарвыканкама, разглядалася некалькі варыянтаў. У прыватнасці, каля плошчы Перамогі, побач з будынкамі дарэвалюцыйных саляных складоў... Але ідэальным вызначылі парк Партызанскай славы... Вылучэнне менавіта гэтага ўчастка для будаўніцтва ўзгаднілі з усімі неабходнымі інстанцыямі.

«За» і «супраць»

Журналіст пабываў на сустрэчы прадстаўнікоў гарвыканкама з незадаволенымі. Гутарылі каля будаўнічага вагончыка. Але нармальнага дыялогу не атрымалася.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АПАВЯШЧАЛЬНІК БЕЗ БАТАРЭЙКІ

Інспектар Андрэй КРЫВЕЦ, пенсіянерка Ніна ФЕДАРУК і старшыня сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Гаспадар проста на павышаных танах спрабаваў давесці, што яму прыкруцілі менавіта гэты апавяшчальнік і ён яго не чапаў. Сварыцца з пенсіянерам не сталі, дамовіліся напісаць ліст сваякам, каб купілі новы апавяшчальнік і прыкруцілі на месца сапсаванага.

Праблемныя жыхары

Асаблівую занепакоенасць у мясцовай улады выклікае тая катэгорыя жыхароў, якія характарызуюцца асацыяльным ладам жыцця. Аднаго такога наведала наша рэйдавая група. Грамадзянін Ш. не мае афіцыйнай рэгістрацыі, бо не афарміў у спадчыну былы дзедаў дом, проста прыехаў з горада і жыве пасля адбывання тэрміну зняволення. Хату, у якую можна зайсці, толькі добра прыгнуўшы галаву, пэўна, не прыбіралі з той пары, як тут жыў дзед цяперашняга жыльца-пенсіянера. Печ, на здзіўленне інспектара, аказалася ў нармальным стане: сумленна падыходзілі да справы колішнія печнікі. А вось у лічыльніку, паводле слоў спецыяліста пажарнай службы, «жучкі» таўшчынёй з палец, што было адзначана ў адпаведных дакументах. Сам жа гаспадар дома лічыць, што ў яго ўсё ў парадку.

— Праблемных жыхароў у вёсках хапае, — расказвае Іна Кузняцова. — Адзін з іх страціў работу і быў асуджаны за забойства страуса на ферме. Цяпер сноўдаецца па вуліцах, жыве невядома за якія сродкі.

Яшчэ адзін пажылы чалавек з вёскі Мацы ніколі не меў праблем з законам, жыве ў доме сваіх бацькоў, сям'і не стварыў. Працаваў у свой час напаўсілы, пенсію атрымаў зусім малую. А калі састарэў і пачаў хварэць, грошай перастала хапаць на жыццё і лекі. Дапамагчы няма каму, акрамя мясцовай улады. Дапамагалі з рамонтам печы, праводкі, ды і проста жыллё прывесці ў парадак. І ўсё роўна з часам, відаць, давядзецца размяшчаць Івана Андрэевіча ў бальніцу сястрынскага догляду.

Ёсць, на жаль, некалькі пажылых жанчын, якія злоўжываюць спіртным. Адна з іх мінулым разам не пусціла правяраючых на парог. А на гэты раз была цвярозая, таму яе дом праверылі на прадмет пажарнай бяспекі. І рэкамендавалі толькі замяніць элемент сілкавання ў апавяшчальніку, астатняе аказалася ў здавальняючым стане.

Узорныя бабулькі

Асобна варта сказаць пра тых жанчын, якія жывуць адны, але клапоцяцца пра свой дом, бяспеку, парадак. У іх чыста, прыбрана, адчуваецца свая рука альбо ўдзел дзяцей, якія прыязджаюць на выхадныя. Ну, такія, напрыклад, як Ніна Федарук са Слаўнага. Раней яе муж Дзмітрый Кляменцевіч быў старастам вёскі. І цяпер, калі Ніна Васільеўна засталася адна, яна па-ранейшаму з'яўляецца ўзорам гаспадыні. А калі зайшлі ў дом да Марыі Мартысюк з Вёскі Вострава, інспектар Андрэй Крывец не ўстрымаўся ад каментарыя: «Нават у гарадской кватэры рэдка сустрэнеш такі ідэальны парадак. Бывае, зойдзеш у дом да шматдзетнай маці: жанчыне няма і трыццаці, пазногці пафарбаваныя ў чорны колер, такога ж «колеру» і пліта, што некалі была белай. Ажно дзяцей тых шкада».

...За дзень мы аб'ехалі тры вёскі, але дома ўдалося застаць не ўсіх са спіса, падрыхтаванага загадзя кіраўніком сельскага Савета. Іна Валер'еўна гаворыць, што падчас такіх паездак выяўляюцца ўсе праблемы адзінокіх людзей, а не толькі праблемы бяспекі іх пражывання. Ну вось, напрыклад, пенсіянеркі пасля інсульту трэба афармляць інваліднасць, а хто гэтым павінен займацца, пакуль не зразумела.

Ёсць у адной з вёсак адзінокая жанчына, былая даярка, якая атрымлівае вельмі добрую пенсію, але сабе батон шкадуе купіць. Усе грошы пенсіянерка аддае пляменнікам. Усё б нічога, каб яны імкнуліся атрымліваць адукацыю ці будаваць кватэры, а то адзін з пляменнікаў, напрыклад, нешта ўкраў. Цётка кампенсавала ўрон разам са штрафам — выйшла пяць мільёнаў на старыя. І што тут зробіш? На ўгаворы заняцца сабой, купіць адзенне, з'ездзіць у санаторый ветэран працы толькі ўздыхае. У кожнай такой пенсіянеркі свая жыццёвая гісторыя. Часам не вельмі вясёлая.

yackevich@zviazda.by

Кобрынскі раён.

...Як альтэрнатыва клубу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

А вось жыхары Вялікай Камароўкі працуюць у гаспадарцы «Газавік-Сіпакова». Справы там ідуць добра, і Вялікая Камароўка квітнее. Летась два новыя домікі з'явіліся, сёлета яшчэ два. Маладыя спецыялісты з задавальненнем едуць сюды працаваць. І горад недалёка, і чыгунка пад бокам. Вось толькі дзіцячай пляцоўкі не хапала. Цяпер — ёсць!

Старшыня Каменналаўскага сельсавета Алена АСІПЕНКА з задавальненнем бярэцца не толькі паказаць, але і пазнаёміць з усімі, хто прыняў актыўны ўдзел у яе будаўніцтве. Бо хоць ідэя і была яе, астатняе ўсё зрабілі жыхары. Прычым, выключна за свае грошы. Пакуль едзем у гэты населены пункт, Алена Пятроўна ўводзіць у курс справы: «Вялікая Камароўка — вёска перспектыўная. У пачатку года тут жыло 211 чалавек, а зараз ужо 216, з іх 44 — дзеці да 16 гадоў. З сацыяльных аб'ектаў толькі бібліятэка. Да школы ў Каменных Лавах дзяцей возіць аўтобус. Іх, дарэчы, па тэрыторыі сельсавета курсіруе два. Сельсавет вялікі, населеных пунктаў шмат, але школа, дзіцячы садок, дом творчасці і амбулаторыя — усіх гэтых аб'ектаў засталося па адным».

Дзіцячую пляцоўку відаць здалёк. Альтанкі, арэлі, нават калодзеж-журавель — праца зроблена немалая. Ірына Лукашкова прывяла пагуляць сваіх маленькіх унучак Рэнату і Ульяну. Яна з тых актыўных людзей, што адразу ж падтрымалі ідэю.

— Дзяцей у вёсцы шмат, вось мы і зрабілі ім пляцоўку, — кажа яна. — Колькі каштавала, дакладна не ведаю, бо кожны нешта купляў і рабіў сам. А вось на фарбу я грошы збірала. Шэсць вёдзер купілі па 55 рублёў новымі грашыма, потым самі фарбавалі. Дзяўчаты пасля працоўнага дня прыходзілі разам з дзецьмі, малыя таксама дапамагалі.

Ірына Барысава ўпрыгожыла альтанкі героямі з казак. Каго тут толькі няма, нават папулярныя сучасныя Маша і мядзведзь. Ірына з мужам і дачкой прыехала ў нашу краіну два гады таму з Данецкай вобласці. Спачатку спрабавалі прыжыцца ў Крычаўскім раёне, але не склалася, і ім параілі перабрацца ў Шклоўскі раён. Пераехалі і вельмі задаволены. Нават бацькоў усюды запрасілі. Цяпер усе разам жывуць у вялікім прыгожым доме, які ім гаспадарка выдзеліла.

Ірына ЛУКАШКОВА старалася, каб на пляцоўцы было ўтульна яе ўнучкам.

— Калі нам далі дом у Вялікай Камароўцы, я звярнула ўвагу на тое, што ў вёсцы дзяцей шмат, а гуляць няма дзе, — кажа Ірына. — Хацелася, каб нарэшце з'явілася месца, дзе яны маглі б сабрацца. Таму, калі было вырашана рабіць пляцоўку, мы з радасцю падтрымалі гэту справу. Прыходзіла дадому, хуценька перакусвала і бегла на пляцоўку — маляваць. Зараз гляджу і радуюся: была пустка, а цяпер такая прыгажосць.

Драўляныя альтанкі — гэта справа рук Валянціна Хадарэнкі. Адна, накшталт хаткі, служыць замест прыпыначнага пункта. Вельмі зручна і ад дажджу ёсць дзе схавацца. На тэрыторыі пляцоўкі альтанкі крыху іншыя, там добра адпачываць у спякоту.

— Я двойчы дзед. Унукі пакуль вельмі малыя, але падрастуць і прыйдуць сюды гуляць, — кажа Валянцін. — Апошнія 8 гадоў я індывідуальны прадпрымальнік, — бяру дзялянкі, раблю лазні і шмат чаго іншага. Звычайна застаецца матэрыял, які для справы не падыходзіць. З яго і канструюю сёе-тое.

Калодзеж на пляцоўцы зрабіў не толькі для прыгажосці, а і для агульнага развіцця.

— Цяпер нават некаторыя дарослыя не ведаюць, што такія ёсць, а дзеці і пагатоў, — усміхаецца майстар. — У маім дзяцінстве такі журавель каля дома стаяў.

Галоўны арганізатар гэтай справы — Мікалай Дуброўскі, а асноўны спонсар — вядомы ў раёне прадпрымальнік і дэпутат Аляксандр Канавалаў.

— Ён мне даў даручэнне людзей мабілізаваць, — усміхаецца Мікалай Дуброўскі. — Жадаючых знайшлося шмат. І грошы здавалі, і самі працавалі. Народная будоўля атрымалася. Я, напрыклад, матэрыялы падвозіў, дамаўляўся наконт работ. Разам з Максімам Шараметам і Юрыем Калачовым рабілі падмурак для альтанак. Анатоль Рандзіцкі слупы ўкопваў, Сяргей Бурцаў са сваім сынам Артурам зрабілі агароджу. Але справы яшчэ не закончыліся. Мы яшчэ там такое пабудуем, што ўсе зайздросціць будуць, але гэта сакрэт.

Алена АСІПЕНКА ведае, як натхніць людзей.

Брат Мікалая Анатоль сакрэт таксама раскрываць не стаў. Як і вялікую навагоднюю праграму, якую тут ужо плануюць. (Анатоль — вядомы ў Камароўцы паэт і артыст). Дарэчы, жыхары суседніх вёсак сталі апошнім часам прыглядацца да вопыту камароўскіх актывістаў. Прайшлі чуткі, што яшчэ ў адным месцы збіраюцца рабіць дзіцячую пляцоўку. Тут толькі радуюцца, бо добрая справа заўсёды заразлівая.

— Праца з людзьмі складаная. Калі прыбраў сметнік, а нехта на гэтым месцы зноў насмеціў, рукі апускаюцца. А вось калі ініцыятыва падтрымліваецца насельніцтвам, перажываеш вялікі пад'ём, — прызнаецца Алена Асіпенка. — Падтрымка, згуртаванасць людзей для нас шмат значаць.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ЦІ БЫЦЬ ХРАМУ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Скептыкі былі гучнымі і напорыстымі — траім адказным асобам было складана канструктыўна з імі спрачацца. Яны пачулі папрокі і пытанні наконт парушэнняў — у прыватнасці, чаму не было нармальна арганізавана грамадскае абмеркаванне? Навошта знішчаць дрэвы? Чаму пасля дзвюх няўдалых экалагічных экспертыз усё-такі дазволілі распачынаць будаўніцтва?

У сваю чаргу тыя, хто адстойвае будаўніцтва, абяцалі ў адказ сабраць тысячы подпісаў «за». (І людзі сапраўды падпісваюцца).

Але скептыкі не здаваліся. Яны патрабавалі паказаць дакументы наконт будаўніцтва. У адказ чулі, што апошнія — гэта сотні лістоў. Няўжо іх трэба было прынесці ў парк? Сышліся на тым, што дакументацыю зацікаўленыя змогуць убачыць пры асабістай сустрэчы ў кабінеце.

Пакуль што будаўніцтва няма

На момант падрыхтоўкі публікацыі будаўніцтва не вялося. Замарозілі, каб, як калісьці было модна гаварыць, «прыйсці да кансэнсусу». Абураныя падкрэслівалі, што ў выніку будаўніцтва будуць знішчаны больш за 200 дрэў, кустоўе. У гарвыканкаме сцвярджаюць, што замест іх высадзяць новыя.

Пракаментаваў сітуацыю **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама Сяргей САГЛАЕЎ.** Паводле яго слоў, незадаволеных пастараюцца зразумець.

Намеснік начальніка аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебскага гарвыканкама Леанід БАГДАНАЎ падкрэсліў: «У адрас кіраўніцтва дзяржавы, аблвыканкама, гарвыканкама накіраваны шэраг зваротаў. Ва ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін будуць дадзены адказы. Але, улічваючы колькасць людзей, якія выступаюць супраць будаўніцтва, вырашылі сустрэцца з імі. Пастараемся пачуць усе аргументы і перадаць іх адказным асобам».

У гарвыканкаме канстатуюць, што грамадскае абмеркаванне будучай будоўлі праводзілася. І ёсць уся неабходная дакументацыя. Як і вынікі экспертызы, якая пацвярджае, што ўлада не парушае прыродаахоўнае заканадаўства.

* * *

Як чалавек, які нарадзіўся ў Віцебску і пражыў тут амаль усё жыццё, выкажу асабісты погляд. Частка парку, пра які ідзе размова, гэта не больш чым дрэвы і кустоўе. І нельга канстатаваць, што парк — любімае месца прагулак многіх гараджан. Раней нярэдка можна было сустрэць і амататараў выпіць піва. Іх было нямала, пакуль не забаранілі распіваць спіртное ў грамадскіх месцах.

Прыхільнікі будаўніцтва сцвярджаюць, што будзе шмат зроблена і для добраўпарадкавання — што ж тут дрэннага?

Калісьці я пісаў, што прыкладна ў гэтым жа месцы малавядомая мастачка са Швейцарыі хацела ўсталяваць «Энергетычную вежу». Арт-аб'ект, на яе думку, «прыцягваў бы» станоўчую энергію. Як кажуць, і смех і грэх. Незадаволеных тады было яшчэ больш, чым цяпер. Вежу ў выніку не ўзвялі... Ці ўзвядуць храм? Час пакажа!

pukshanski@zviazda.by

СПРАВЫ ВЯСКОВЫЯ

Аўчынка вартая вырабу

Ці выгадна трымаць на падворку жыўнасць

Сумна, але факт. З кожным годам усё больш вяскоўцаў адмаўляюцца ад асабістай падсобнай гаспадаркі. Але ёсць і тыя, хто не ўяўляе свайго жыцця без хатняй жывёлы. Як, напрыклад, Сяргей ЧАТЫРКА з Новай Вёскі Стаўбцоўскага раёна.

Сяргей Іванавіч у свой час узначальваў Варацішчанскі сельскі Савет дэпутатаў. У выніку аптымізацыі тэрыторыю далучылі да іншай. І тады ён, па спецыяльнасці заатэхнік, вырашыў пашырыць сваю гаспадарку. Цяпер на падворку, можна сказаць, цэлая міні-ферма.

— У мяне пяць кароў, качкі, куры, кот і сабака. Зрэшты, мы ўвесь час трымалі рагулю. А цяпер, так бы мовіць, хобі перарасло ў прафесію, — жартуе мой суразмоўца і ўжо сур'ёзна дадае: — Вельмі прывязаўся да сваіх карміліц: здаць на мяса не магу. Крыху павышу голас, а яны ўжо адчуваюць, што няправільна сябе паводзяць. Каровы сталі амаль што членамі нашай сям'і. Але адзін не справіўся б з жывёлай. Дапамагаюць сын-дзевяцікласнік, дзве дачкі са сваімі мужамі і жонка.

Пракарміць такі гурт, вядома, не так проста. У Сяргея Чатыркі тры гектары зямлі, дзе ён сее цімафееўку і канюшыну. Частку адводзіць пад пашу. На іншай нарыхтоўвае сена на зіму. Акрамя таго, Сяргей Іванавіч садзіць бульбу, кармавыя буракі, збожжа, а на хлебапрыёмным пункце купляе камбікорм. Разам з тым выкарыстоўвае і прысядзібны ўчастак маці — пад бульбу, аднагадовыя сумесі: авёс, гарох, віку — для падкормкі жывёлы. Дробныя клубні, яблыкі рупліўцу аддаюць пенсіянеры. Калі раней яны імкнуліся мець каля дома вялікі ўчастак, то цяпер нават 25 сотак не ў стане апрацаваць: няма сіл і здароўя. А прадукцыю, што вырасцілі, людзі старэйшага пакалення не прывыклі выкідваць на сметнік, нават шалупінне ад бульбы. Сяргей Іванавіч стараецца разлічыцца з імі, але вяскоўцы адмаўляюцца ад грошай. Нават крыўдуюць у адказ. Сёлета тону збожжа па калектыўным дагаворы ў кошт натуральнай аплаты атрымала жонка, якая працуе бухгалтарам у адкрытым акцыянерным таварыстве «Новы Двор». На цукровым камбінаце гаспадар купляе жамерыны. Летась прывёз тры машыны. Папярэдне яго ахаладжвае, падсольвае: хапае да самай вясны.

— І колькі грошай траціце на кармы? — цікаўлюся ў Сяргея Іванавіча.

— За камбікорм, у прыватнасці, на працягу года аддаю дзесьці 1,5—2 млн рублёў да дэнамінацыі. Але ж і свайго збожжа пасля абмалоту дастаткова. У мінулым годзе, напрыклад, добра ўрадзілі жыта і трыцікале. Сёлета сеяў яравую пшаніцу і ячмень. Ураджайнасць слабейшая, чым летась, але ўсё ж намалаціў 2,5 тоны. У мяне ёсць міні-млын «Фермер». Так што не трэба прасіць чужых людзей, каб гэта зрабілі. У выніку эканомлю на транспарце, іншых затратах, — канстатуе Сяргей Чатырка. — Ёсць у мяне мотаблок, якім падкошваю траву. А так наймаю тэхніку для апрацоўкі зямлі ў прыватніка. З гэтым праблем няма.

Сёлета гаспадар здаў у калгас чацвёра цялят. Малыя месяц пастаялі каля сваіх матуль. Таму на свежым малацэ добра прыбаўлялі ў вазе: па 1200 грам у суткі. Выраслі да 80 кілаграмаў. А за кілаграм жывой вагі сельгасарганізацыя плаціць па 32 тыс. старых рублёў. Добрая капейка атрымліваецца. На сваіх карміліц Сяргей Чатырка не можа нарадавацца: даюць у дзень і па 30, і па 32 літры малака. Бывае і менш, у залежнасці ад пары года. Кароў, як жартуе сам, шукаў па ўсёй Беларусі. Цяпер купіць добрую карову праблематычна: у людзей іх засталося — па пальцах пералічыць. Знайшоў тое, што было трэба, у Клецку, Ганцавіцкім, Івацэвіцкім раёнах. Як правіла, за рагулю просяць да 18 млн рублёў. Можна кошт збіць і да 15 млн рублёў.

У найбліжэйшай перспектыве былы заатэхнік плануе атрымаць новае, так бы мовіць, удасканаленае патомства, каб малако было больш тлустае. Хаця, зрэшты, і на цяперашніх гадаванак грэх скардзіцца: тлустасць прадукцыі 4,5% пры стандарце 3,6%.

— Сёлета рагуль пакрыў спермай айшырскіх быкоў. Гэта канадская ўніверсальная парода, якая пераносіць і спёку, і холад, дае якаснае малако. Як заатэхнік эксперыментую, хочацца чагосьці новенькага, — прызнаўся мой суразмоўца. — На жаль, у Беларусі не змаглі вывесці сваю пароду кароў. Проста пакрылі жывёлу галштына-фрызамі. Часта сустракаюся на комплексе са спецыялістамі, дык яны скардзяцца, што жывёла малочная, але надта далікатная, капыты і косці слабыя, хварэе на цыроз печані. А дзе ж нашы родныя чорна-стракатыя, сівенькія кароўкі, якія былі ўстойлівыя да лейкозу, туберкулёзу? Ды і ў ежы былі неперабарлівыя. Раней ім давалі ў вёсцы ўсё — і сечку, і сена, і бульбоўнік. А жылі па 8—10 гадоў.

Каб кароў было больш, то фермер здаваў бы малако дзяржаве. А так частку аддае дочкам, сваякам і крыху прадае дачнікам. Летам раней па 5—6 млн рублёў выручаў, зімой — менш. Прыбытак невялікі. Але затое сям'я заўсёды была забяспечана свежымі прадуктамі: малаком, тварагом, маслам. Дочкі гатуюць сырнікі, запяканку. Карацей, усе задаволеныя.

— Сутнасць не ў грашах, — кажа Сяргей Чатырка. — Галоўнае, ёсць справа для душы. — Пяць кароў магу падаіць крыху больш як за гадзіну. Гэта калі шмат малака. Цяпер спраўляюся і за 50 хвілін. Шкада, не папярэдзілі, што прыедзеце, зрабіў бы тварог, збіў масла, засмажыў бы бройлера — яны ў мяне выраслі амаль што да 7 кілаграмаў. А так, можа, чаю або кавы хоць вып'ем...

Як прызнаўся Сяргей Іванавіч, вельмі клапотна даглядаць за каровамі. Трэба рана ўстаць, каб падаіць, прыбраць у стойле, выгнаць на пашу, нарыхтаваць сена на зіму. Але разам з тым выгадна. Карова сама сябе ўтрымлівае і дапамагае ўтрымліваць астатнюю свойскую жывёлу. Ды і свежыя прадукты круглы год на стале. Салома ад збожжавых ідзе на падсцілку. Потым прыбіраецца і складзіруецца, а вясной выкарыстоўваецца для ўгнаення агарода. У выніку вырошчваецца экалагічна чыстая прадукцыя. А гэта гарантыя здароўя ўсёй сям'і. Раней у вёсцы не ўяўлялі свой падворак без каровы — яна выратоўвала ў самыя цяжкія часы. Ды і сёння дапамагае многім вяскоўцам вучыць ды выводзіць у людзі сваіх дзяцей.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

lazovskaya@zviazda.by

ЖЫЦЬ УЛАСНЫМІ ДАХОДАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Апошнім часам павялічылася доля паступлення ў бюджэт ад недзяржаўнага сектара эканомікі. Яна складае 50% даходаў бюджэту. Прыватны сектар цалкам плаціць усе падаткі раёну. Найбольш прыбытковыя — гэта завод вымяральных прыбораў «Энергамера» ў Фаніпалі, «Араматык» па вырабе харчовых інгрэдыентаў, «МАВ» па вытворчасці лакафарбавых матэрыялаў. Вядома, працаваць з уласнымі даходамі нашмат лепш, чым чакаць паступлення з рэспубліканскага бюджэту. Нашы выдаткі прымеркаваны менавіта пад тэрміны паступлення падаткаў. Напрыклад, тэрмін аплаты плацяжоў — 20-га, таму ў гэтых чыслах мы аддаём зарплату нашым настаўнікам.

Зямлю — людзям

Большасць выдаткаў накіравана на фінансаванне сацыяльнай сферы. 65% ад бюджэту ідзе на ахову здароўя, адукацыю і культуру. Астатнія 35% — гэта жыллёва-камунальная гаспадарка, выдаткі на добраўпарадкаванне, датаванне транспарту. Сельскай гаспадарцы плацяцца надбаўкі на рэалізаваныя малако і жывёлу. З кожным годам выдаткі растуць, таму трэба прыкладаць намаганні, каб і даходы адпаведна павялічваліся.

— Год на год не прыходзіцца, сёлета ў нас праблема з ростам даходу бюджэту, — тлумачыць Яўгенія Ліпніцкая. — Асноўнай крыніцай з'яўляецца падаходны падатак. Ён займае 55% і залежыць ад таго, як павялічваецца заработная плата. На жаль, зарплата расце не тымі тэмпамі, якімі хацелася б. Калі мы складалі бюджэт, планавалі яе рост у гэтым годзе на 10%. Але такога няма. За дзевяць месяцаў яна павялічылася толькі на 1,8%, адпаведна гэтаму і прыбыткі, таму сёлета адчуваем вялікае напружанне з выкананнем даходнай часткі бюджэту.

Але зніжэнне чымсьці трэба кампенсаваць: у нас карыстаюцца попытам зямельныя ўчасткі. Арганізаваны аўкцыён па іх продажы ў прыватнае карыстанне. Гэта дае нам добры даход. Зямля прадаецца і пад жыллёвую, і пад шматпавярховую забудову. За дзевяць месяцаў — 154 участкі, сума паступленняў — 2 млн рублёў. Участкі ў Фаніпалі карыстаюцца вельмі добрым попытам. Кошт даходзіць да 50 тыс. рублёў за пусты кавалак зямлі.

Адна з балючых тэм для многіх раёнаў — працоўная міграцыя. Але Дзяржынскі гэтым не хварэе. Колькасць людзей, якія пераязджаюць, не крытычная, таму што даволі шмат работы ёсць і на малой радзіме. Па словах Яўгеніі Ліпніцкай, у сталіцу накіроўваюцца звычайна тыя, хто працуе ў сацыяльнай сферы. У Мінску ствараюцца больш спрыяльныя ўмовы, у тым ліку плацяць больш вялікія надбаўкі.

Трацім з розумам

Летась на сродкі бюджэту ў Дзяржынску з'явіўся новы дзіцячы сад. Сёлета сярэдняя школа №4 была ўцеплена згодна з энергаэфектыўнымі стандартамі. Гэта стала вынікам работы Дзяржынскага раёна з ПРААН.

— Мы нашу бюджэтную сферу заўсёды нацэльваем на тое, што трэба ўсюды эканоміць. — заўважае Яўгенія Ліпніцкая. — Інакш грошай заўжды будзе недастаткова. Трэба, каб і штат быў аптымальны. Пасля выплаты зарплаты самыя вялікія расходы ідуць на камунальныя паслугі, ацяпленне. Неабходна, каб усюды стаялі лічыльнікі, была сістэма заахвочванняў за эканомію электраэнергіі, цепланасіцеляў, лямпачкі — энергазберагальныя. Бюджэтныя ўстановы кожны год павінны імкнуцца да эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў.

anisovich@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 1 лістапада 2016 года.

ВІЦЕБСК НАБУДЗЕ НОВЫЯ РЫСЫ

«Чаромушкі» па-віцебску

Гарвыканкам намеціў пабудаваць новыя мікрараёны. У прыватнасці, «Чаромушкі» з'явяцца недалёка ад мікрараёнаў «Білева» (у паўднёва-ўсходняй частцы паміж Маскоўскім праспектам і Будаўнікоў). Для гэтага трэба зруйнаваць жыллё ў прыватным сектары. Дарэчы, пасля завяршэння будоўлі ў мікрараёнах «Білева-1,2,3» зоймуцца будаўніцтвам «Білева-4». З'явіцца і квартал «Усходні» (недалёка ад прадпрыемства па вырабе тэлевізараў «Віцязь»).

На іншай ускраіне, якую тутэйшыя называюць «Маркаўшчына», будзе мікрараён сядзібнай забудовы «Арэхава». Шмат катэджаў пабудуюць і ў «Віцелева».

У самым цэнтры гарадскія планіроўшчыкі таксама ўбачылі магчымасць упісаць мікрараён. Недалёка ад Летняга амфітэатра, каля праспекта Фрунзэ, задумана пабудаваць жыллё агульнай плошчай да 50 тысяч «квадратаў». Усё больш старых індывідуальных забудоў на вуліцах недалёка ад цэнтра будзе знесена. На іх месцы з'явяцца шматпавярховыя дамы.

Праблема мікрараёнаў-новабудоўляў — катастрафічны недахоп школ, садкоў, медыцынскіх устаноў. Узвядзенне ж сацыяльнай інфраструктуры паралельна з жылымі кварталамі патрабуе дадатковага фінансавання.

І помнік Хатабычу

Многія з іншагародніх, хто меў магчымасць прайсціся па Віцебску, здзіўляліся вялікай бясплатнай «паркоўцы» на плошчы Свабоды. Ад яе праз дарогу спуск да галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «Славянскага базару». Старажылы на свае вочы бачылі, як на гэтым месцы ў 1950-я гады ўзарвалі праваслаўны Мікалаеўскі кафедральны сабор. Ён і іншыя забудовы былога езуіцкага калегіума займалі амаль усю тэрыторыю цяперашняй плошчы. Першапачаткова на гэтым месцы ў XVII стагоддзі пабудавалі драўляны касцёл. У XIX стагоддзі ўжо каменны храм быў перададзены праваслаўным.

Гадоў шэсць таму ў гарадскіх планах было аднаўленне комплексу гістарычных забудоў. Хочацца верыць, што задуманае калісьці рэалізуюць. А пакуль што вырашылі плошчу, на якой капітальных забудоў няма, зрабіць пешаходнай. Сучасны выгляд атрымае і суседні парк Фрунзэ, дзе знаходзіцца фантан. Цяпер вядуцца работы ў парку па пашырэнні рэчышча ракі Віцьба, у гонар якой атрымаў назву горад.

На пешаходнай вуліцы недалёка ад плошчы ўжо ў наступным годзе плануюць усталяваць скульптуру Хатабыча. Вядома, што аўтар папулярнай дзіцячай казкі Лазар Лагін (сапраўднае прозвішча Гінзбург) — віцяблянін. А недалёка ад Дзвіны можна будзе ўбачыць скульптуру рыбкі.

Як на малюнку... Напалеона

У некалькіх хвілінах пешшу ад плошчы Свабоды фантан, які сімвалізуе тры віцебскія ракі. На гэтым месцы таксама знаходзіўся храм. Вельмі добрая навіна: з нуля плануецца аднавіць касцёл Святога Антонія. Пра адпаведную ініцыятыву «Звязда» паведаміла адна з першых. Гэты касцёл можна ўбачыць і на малюнку вядомага на ўвесь свет Напалеона Орды.

Як адзначыў **біскуп Віцебскі Алег БУТКЕВІЧ,** у Міністэрстве культуры падтрымалі ідэю аднаўлення. Пасля ўзгаднення ва ўсіх інстанцыях можна будзе распачынаць работы. Адзіны нюанс — будынак будзе стаяць не па перыметры падмурка, а трохі далей ад праезджай часткі вуліцы Леніна. Каб не ствараць праблем з існуючым дарожным рухам. У 1768-м годзе гэты каменны касцёл асвяцілі, закрылі ў 1940-м. Тут потым размясцілі антырэлігійную выставу. Цікавы факт: сярод экспанатаў былі і мошчы святой Еўфрасінні Полацкай. Знішчылі касцёл у 1961-м. Летась каталіцкія вернікі выступілі з ініцыятывай захавання іншага культавага будынка — капліцы ў батанічным садзе, пабудаванай у 1859-м годзе.

Нядаўна намеснік начальніка аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва расказаў гараджанам пра будучыню Віцебска. У выставачнай зале «Духаўскі круглік» Цэнтра культуры «Віцебск», дзе адбылася гутарка, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Былі і прапановы, якія горад абяцаў падтрымаць. Напрыклад, чаму б жыхарам не высаджваць дрэвы ў гонар вяселля, нараджэння дзяцей і ўнукаў? Ідэя, безумоўна, заслугоўвае рэалізацыі. Такім чынам, тутэйшыя змогуць зрабіць вуліцы і паркі больш зялёнымі не толькі падчас суботнікаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Рынкавая плошча на малюнку Напалеона Орды. Злева — адноўленая Свята-Васкрасенская царква, за ёй — Ратуша, справа — касцёл святога Антонія Падуанскага.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ На сувязі

КОЛЬКІ СПАЖЫЎ — СТОЛЬКІ І ЗАПЛАЦІЎ

З 1 лістапада 2016 года кампанія МТС уводзіць новы для Беларусі інтэрвальны прынцып тарыфікацыі мабільнага інтэрнэту — «Адкрыты інтэрнэт». Абанентаў будуць апавяшчаць пра бягучае спажыванне мабільнага інтэрнэту, што дазволіць кантраляваць свае выдаткі на сувязь.

Як запэўнівае аператар, выйсці за межы пакета і «аказацца ў мінусе» цяпер проста немагчыма. Калі кліент выкарыстаў менш трафіка, ён аплачвае меншы аб'ём, калі яму спатрэбілася больш — пераходзіць на новы ўзровень. Ніякія дадатковыя паслугі падключаць не трэба: пры пераходзе на наступны інтэрвал тарыфікацыі абанент будзе атрымліваць SMS-апавяшчэнне.

Аплата за спажыты інтэрнэт-трафік будзе праводзіцца па прынцыпе інтэрвалаў (да 100 Мб — 1,5 рубля, ад 101 да 500 Мб — 3 рублі, ад 501 Мб да 2 Гб — 7 рублёў і г.д.).

З 1 лістапада перасталі дзейнічаць усе пакетныя паслугі, акрамя «Інтэрнэт Mini», «Інтэрнэт Midi» і «Maxi Інтэрнэт». Інтэрвальная тарыфікацыя ўкаранёна на ўсіх тарыфных планах, за выключэннем «Абсалют», «МТС смарт Гасцявы» і карпаратыўных тарыфаў.

Самастойна даведацца пра бягучы аб'ём выкарыстанага інтэрнэт-трафіка можна з дапамогай бясплатнага USSD-запыту * 444 # або адпраўкі SMS з любым сімвалам на нумар 444.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

Новыя платныя кіламетры

З пачатку месяца ўведзена плата за праезд на новых участках рэспубліканскіх аўтадарог М-5/Е 271 і Р-23.

Такое рашэнне замацавана ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.10.2016 года №875 «Аб унясенні змянення у Палажэнне аб парадку збірання платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах Рэспублікі Беларусь».

З 1 лістапада платнымі сталі два новыя ўчасткі рэспубліканскіх аўтадарог. Плата за праезд будзе брацца на аўтадарозе Р-23 Мінск — Мікашэвічы з 80 па 99 кіламетр і аўтадарозе М-5/Е 271 Мінск — Гомель са 130 па 212 кіламетр.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Организатор торгов, ликвидатор ООО «Производственно-торговая компания «Мастервуд» – Никитина Алеся Федоровна, действующая на основании Протокола внеочередного собрания участников ООО «ПТК «Мастервуд» от 03.06.2016 г., сообщает о проведении торгов по продаже имущества, а именно:

Предмет торгов:

№ лота	Наименование лота	Кол-во, ед.	Начальная цена за 1 ед. лота в белорусских рублях	Шаг торгов 5%	Задаток 10%
1	Автотранспортное средство Renaut Masscot. 2007 г.в., VIN VF354ANA000037378	1	29 796	31 285,8	2 979,6
2	Деревообрабатывающий фрезерно-гравировочный станок с ЧПУ мод. BTM1325M	1	7 123,2	7 479,36	712,32
3	Станок для шлифовки стекла GTC-011L	1	2 330,4	2 446,92	233,04
4	Станок кромкооблицовочный автомат AKRON 440K1-ARTECH	1	40 420,8	42 441,84	4 042,08
5	Станок торцовочный 2-пильный мод. TR2ACE	1	23 066,4	24 219,72	2 306,64
6	Станок универсальный фрезерный FUS-22	1	10 754,4	11 292,12	1 075,44
7	Станок форматно-раскроечный круглопил мод. Actra400CE	1	30 466,8	31 990,14	3 046,68
8	Пылесос CTL26E	2	721,2	757,26	72,12
9	Кромкооблицовочный станок BRANDT Optimal KTD 72	1	4 872	5 115,6	487,2
10	Станок сверлильный ALFA21	1	3 470,4	3 643,92	347,04

Продавец – ООО «ПТК «Мастервуд». Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.
До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичной форме по следующим платежным реквизитам: ООО «ПТК «Мастервуд», р/с 3012212717007, вид валюты 933 (белорусские рубли), код банка 270 в ЗАО «Альфа-банк», УНП 191605354.
Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 25 ноября 2016 года в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Ежи Гедройца, д. 2, помещение 240.
Окончание приема заявок на участие в торгах прекращается за 7 дней до даты на которую назначено проведение торгов.
Задаток должен поступить на указанный счет Продавца не позднее 25 ноября 2016 года.
Торги состоятся 02 декабря 2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Ежи Гедройца, дом. 2, помещение 240.
Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в объявлении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:
- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя — копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица — доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации — легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.
Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.
Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Результаты торгов оглашаются в день проведения торгов.
В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. ул. Ежи Гедройца, д. 2, помещение 240. Тел.: (029) 645 19 47

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, обращенного в доход государства

ЛОТ №1: Капитальное строение с инв. №710/С–72576 – гараж 137, ПГСК 24, расположенное по адресу: Могилевская обл, г. Бобруйск, ул. Крупской, 15А/137, общ. пл. 20,7 кв. м, фундамент здания – бетонный, стены – кирпичные, перекрытия – ж/бетонное, кровля – совмещенная, полы – бетонные, проемы – металлические ворота, электроснабжение.
Сведения о земельном участке: гараж расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000009001757, расположенном по адресу: Могилевская обл, г. Бобруйск, ул. Крупской, 15А.

Начальная цена продажи 8208,00 рублей в денежных знаках образца 2009 г.
или 82 080 000 рублей в денежных знаках образца 2000 г.

Сумма задатка 820,80 рублей в денежных знаках образца 2009 г.
или 8 208 000 рублей в денежных знаках образца 2000 г.

Расчетный счет для перечисления задатка	Получатель платежа — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 703 г. Минск, МФО 153001369
Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион проводится 06 декабря 2016 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 05 декабря 2016 года до 15.00
Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен предоставить Организатору:
- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка; - паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица — резиденты Республики Беларусь — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; -юридические лица — нерезиденты Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утв. Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Условие — наличие не менее 2-х участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

6 декабря 2016 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 3) в 10-00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб. (без учета деноминации/ с учетом деноминации)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения), руб. (без учета деноминации/с учетом деноминации)
Лот №1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 31	0,1499	625680202201000291	90000000/ 9000,00	10470700/ 1047,07
Лот №2	Дещенский сельисполком	аг. Дещенка, ул. Молодежная, уч. 16	0,1498	625680204501000392	120000000/ 12000,00	12383900/ 1238,39
Лот №3	Дещенский сельисполком	д. Городище, ул. Центральная, уч. 2Б	0,1331	625680203401000036	90000000/ 9000,00	11957200/ 1195,72
Лот №4	Дещенский сельисполком	д. Теплень, ул. Новая, уч. 18Б	0,1482	625680213201000198	90000000/ 9000,00	11957200/ 1195,72
Лот №5	Дещенский сельисполком	д. Яченка, ул. Центральная, уч. 71	0,1500	625680215801000167	75000000/ 7500,00	11957200/ 1195,72

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению.
Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500114 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 601068832, код платежа — 04901.
Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж) с 8-00 до 17-00 по рабочим дням по **1 декабря 2016 года** включительно.
Участники аукциона должны представить следующие документы:
• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;
• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.
Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.
Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.
Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.
Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.
Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.
Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 35111, 35135, 35151.

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
31 октября 2016 года
Сушко С.А.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ВОСЬМОГО ВЫПУСКА
Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:
на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДЭКА-ПЛАСТ»; сокращенное – ТАА «ДЭКА-ПЛАСТ»;
на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – Эмитент); сокращенное – ООО «ДЕКО-ПЛАСТ».
2. Место нахождения эмитента: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 5-й этаж, офис 3; телефон/факс: 8 (017) 346 41 37; электронный адрес (e-mail): info@tapas.by.
3. Эмитент зарегистрирован Минским областным исполнительным комитетом 23 июля 2002 г. Регистрационный номер — 600422579.
4. Уставный фонд Эмитента составляет 5 560 000 000 белорусских рублей (без учета деноминации 1 июля 2016 г., в денежных знаках образца 2000 г.) или 556 000 белорусских рублей (с учетом деноминации 1 июля 2016 г., в денежных знаках образца 2009 г.).
5. Основной вид деятельности эмитента — реализация проектов, связанных со строительством зданий (код 41100 ОКРБ 005-2011).
